АРГАНІЗАЦЫЯ
АБ’ЯДНАНЫХ НАЦЫЙ
БЕЛАРУСЬ

# ДАКЛАД АБ ВЫНІКАХ ДЗЕЙНАСЦІ АРГАНІЗАЦЫІ АБ’ЯДНАНЫХ НАЦЫЙ У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

## 2020



АРГАНІЗАЦЫЯ АБ’ЯДНАНЫХ НАЦЫЙ
БЕЛАРУСЬ

# Даклад
# аб выніках дзейнасці
# Арганізацыі Аб’яднаных Нацый
# у Рэспубліцы Беларусь

2020

# ЗМЕСТ


4 Прадмова Пастаяннага Каардынатара ААН у Беларусі

6 Нацыянальныя партнёры

8 Міжнародныя партнёры і донары

8 Краінавая група ААН

9 Глава 1. Ключавыя падзеі ў Беларусі

10 Глава 2. Падтрымка работы па рэалізацыі нацыянальных прыярытэтаў у галіне развіцця, аказаная сістэмай развіцця ААН у адпаведнасці з Рамачнай праграмай супрацоўніцтва

10 2.1. Агляд вынікаў ажыццяўлення Рамачнай праграмы супрацоўніцтва

12 2.2. Прыярытэты, доўгатэрміновыя і кароткатэрміновыя вынікі, прадугледжаныя Рамачнай праграмай супрацоўніцтва

14 2.2.1. Меры, прынятыя ААН у сувязі з пандэміяй COVID-19

22 2.2.2. Падтрымка ў дасягненні мэт устойлівага развіцця, аказаная ААН

29 2.3. Падтрымка партнёрстваў і фінансаванне Павесткі дня на перыяд да 2030 года

34 2.4. Вынікі праграмы павышэння зладжанасці работы ўстаноў ААН: узгодненасць, эфектыўнасць і дзейснасць устаноў ААН

36 2.5. Ацэнка дзейнасці і атрыманыя ўрокі

38 2.6. Агляд фінансавага становішча і мабілізацыя рэсурсаў

40 Глава 3. Асноўныя напрамкі работы КГААН у 2021 годзе

Спіс скарачэнняў

# ПРАДМОВА ПАСТАЯННАГА КААРДЫНАТАРА ААН У БЕЛАРУСІ



З задавальненнем прадстаўляю вам першы **даклад аб выніках работы ААН у Беларусі**, у якім адлюстравана дзейнасць устаноў, фондаў і праграм ААН, якія аказвалі садзейнічанне працэсу развіцця Беларусі ў 2020 годзе. Нягледзячы на зменлівы кантэкст, асноўная ўвага сістэмы ААН у Беларусі была па-ранейшаму засяроджана на Мэтах устойлівага развіцця (МУР) і становішчы **ўразлівых груп насельніцтва.** У дакладзе падрабязна выкладзена работа, якую мы зрабілі, і вынікі, якіх мы дамагліся, дапамагаючы беларусам дасягнуць МУР.

Як і ў іншых частках свету, пандэмія COVID-19 аказала прамы ўплыў на сферу аховы здароўя і сацыяльна-эканамічную сітуацыю ў краіне. Структуры сістэмы ААН у Беларусі ў супрацоўніцтве з нацыянальнымі і міжнароднымі партнёрамі прынялі неадкладныя меры і падтрымалі **нацыянальныя намаганні па барацьбе з COVID-19**, прадаставіўшы прадметы першай неабходнасці і падтрымку на суму каля 7,5 млн дол. ЗША. Акрамя таго, ААН у Беларусі сфармулявала набор доўгатэрміновых прыярытэтаў і ўключыла іх у План сацыяльна-эканамічных мер у адказ на COVID-19 у Беларусі.

У той час як Беларусь працягнула **работу па рэалізацыі МУР** і дасягнула значных поспехаў, такіх як прыняцце заканадаўства аб скарачэнні выкарыстання аднаразовага пластыку і забеспячэнні збору адходаў, аднаўленне неэфектыўна асушаных тарфянікаў і рэалізацыя пілотных ініцыятыў у сферы «зялёнай» эканомікі, распрацоўка Нацыянальнай стратэгіі «Актыўнае даўгалецце — 2030», фарміраванне сеткі цэнтраў дапамогі дзецям малодшага ўзросту пры Міністэрстве аховы здароўя і частковая дэкрыміналізацыя перадачы ВІЧ (што мае важнае значэнне для 28 000 чалавек, якія жывуць з ВІЧ у краіне); падзеі, што адбыліся пасля прэзідэнцкіх выбараў у жніўні 2020 года, у той жа час выявілі адсутнасць прагрэсу ў дасягненні МУР 16. Неабходнасць забеспячэння належнага кіравання і захавання правоў чалавека стала як ніколі відавочнай. ААН выступіла ў падтрымку агульначалавечых каштоўнасцей і нагадала ўладам аб існуючых у іх міжнародных абавязацельствах у галіне правоў чалавека.

2020 год стаў апошнім годам рэалізацыі Рамачнай праграмы ААН па аказанні дапамогі ў мэтах развіцця на 2016–2020 гады (РПААНДР) — праграмы, у рамках якой Беларусі была аказана міжнародная дапамога ў мэтах развіцця на суму 85 млн дол. ЗША ў галіне кіравання, эканамічнага развіцця, экалагічнай устойлівасці і развіцця чалавечага капіталу. На працягу гэтага года мы таксама засяродзілі сваю ўвагу на **правах жанчын** у Беларусі, прыняўшы ўдзел у распрацоўцы **шостага Нацыянальнага плана дзеянняў па забеспячэнні гендарнай роўнасці на 2021–2025 гады** і выступіўшы ў падтрымку выпрацоўкі новых падыходаў да рашэння старых праблем, такіх як традыцыйныя гендарныя ролі і стэрэатыпы, гендарны разрыў у аплаце працы, які павялічваецца, неабходнасць аказання паслуг аховы здароўя з улікам гендарнай праблематыкі, а таксама гендарны разрыў у чакаемай працягласці жыцця. Мы ўкаранялі наватарскія падыходы ў сферы аховы рэпрадуктыўнага здароўя і прымалі меры ў мэтах процідзеяння насіллю. ААН таксама прымала ўдзел у рабоце Нацыянальнага савета па гендарнай палітыцы пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, які з'яўляецца важнай платформай для супрацоўніцтва ААН, нацыянальных партнёраў і грамадзянскай супольнасці па пытаннях гендарнай роўнасці і садзейнічае ўстойліваму развіццю краіны.

Пашырэнне правоў і магчымасцей жанчын па-ранейшаму з'яўлялася адным з галоўных прыярытэтаў сістэмы ААН у Беларусі. Мы выканалі самаацэнку нашых метадаў работы і выкарысталі ўнутраныя **ацэначныя лісты гендарнага ўліку** ў якасці механізма падсправаздачнасці, які дазваляе ацаніць эфектыўнасць уліку гендарнай праблематыкі ў рабоце ААН. Супаставіўшы вынікі апошняй ацэнкі з вынікамі за 2017 год, магу з задавальненнем адзначыць устойлівы прагрэс у пашырэнні правоў і магчымасцей жанчын у сістэме ААН у Беларусі. Мы таксама адвялі жанчынам цэнтральнае месца ў нядаўна распрацаванай Рамачнай праграме Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па супрацоўніцтве ў галіне ўстойлівага развіцця на 2021–2025 гады і забяспечылі больш эфектыўны ўлік патрэбнасцей жанчын шляхам сумеснай распрацоўкі праграм, маніторынгу і ацэнкі, а таксама нашага ўнутранага механізма каардынацыі па пытаннях гендарнай роўнасці. Гендарная роўнасць застанецца скразным элементам сумеснай інфармацыйна-растлумачальнай дзейнасці ААН. Нашы супрацоўнікі ў большай ступені задаволены магчымасцямі для жанчын і здольныя больш эфектыўна праводзіць улік гендарнай праблематыкі ў галінах сваёй адказнасці.

Спадзяюся, што вам будзе цікава азнаёміцца з падрабязнай інфармацыяй аб нашай рабоце ў 2020 годзе, прыведзенай у гэтым дакладзе, які быў падрыхтаваны Офісам Пастаяннага каардынатара ААН у цесным супрацоўніцтве з установамі, фондамі і праграмамі ААН і з выкарыстаннем пашыраных магчымасцей узаемадзеяння, новых тэхналогій і сістэм справаздачнасці, створаных у рамках **рэформы Сістэмы развіцця ААН**. Ад імя краінавай групы ААН і 20 устаноў-рэзідэнтаў і нерэзідэнтаў, фондаў і праграм, якія сумесна працавалі над дасягненнем так неабходных вынікаў, хачу падзякаваць усім вам за супрацоўніцтва, падтрымку і партнёрства. У 2021 годзе мы працягнем выкарыстоўваць свае моцныя бакі, забяспечваючы ўзаемадзеянне зацікаўленых бакоў для дасягнення МУР і выкарыстоўваючы знешні экспертны вопыт усёй Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у мэтах падтрымкі развіцця і сацыяльнай еднасці ў Беларусі.

*Іаана Казана-Вішнявецкі*
*Пастаянны каардынатар ААН у Беларусі*

## НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ПАРТНЁРЫ

**Нацыянальныя ведамствы, установы і кампаніі**:

- Дзяржаўнае прадпрыемства "Акадэмфарм"
- Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях
- Дзяржаўны мытны камітэт
- Дзяржаўны пагранічны камітэт
- Міністэрства адукацыі
- Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва
- Міністэрства аховы здароўя
- Міністэрства замежных спраў
- Міністэрства па надзвычайных сітуацыях
- Міністэрства працы і сацыяльнай абароны
- Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя
- Міністэрства сувязі і інфарматызацыі
- Міністэрства ўнутраных спраў
- Міністэрства эканомікі
- Міністэрства энергетыкі
- Міністэрства юстыцыі
- мясцовыя і рэгіянальныя органы дзяржаўнага кіравання
- Нацыянальная акадэмія навук
- Нацыянальная рэферэнс-лабараторыя
- Нацыянальны статыстычны камітэт
- Нацыянальны сход
- пастаўшчыкі медыцынскіх паслуг
- РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава
- Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Беларуская атамная электрастанцыя»
- Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр медыцынскіх тэхналогій, інфарматызацыі, кіравання і эканомікі аховы здароўя
- Рэспубліканскі цэнтр арганізацыі медыцынскага рэагавання
- Рэспубліканскі цэнтр экстраннай медыцынскай дапамогі

**Універсітэты і акадэмічная супольнасць**:

- Беларуская медыцынская акадэмія паслядыпломнай адукацыі (БелМАПА)
- Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
- Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка
- Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
- Бізнес-школа ІПМ
- Міжнародны ўніверсітэт "МІТСО"
- Палескі дзяржаўны ўніверсітэт
- Цэнтр эканамічных даследаванняў BEROC

**Арганізацыі грамадзянскай супольнасці**:

- Асацыяцыі адвакатаў
- Асацыяцыя адукацыі і асветы на працягу ўсяго жыцця
- Асацыяцыя «Адукацыя для ўстойлівага развіцця»
- Асацыяцыя маладых хрысціянскіх жанчын
- Беларускае Таварыства Чырвонага Крыжа
- Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам (БелАДДІіМІ)
- Беларуская асацыяцыя інвалідаў
- Беларуская асацыяцыя клубаў ЮНЕСКА
- Беларускі рух медыцынскіх работнікаў
- Беларускі Хельсінкскі камітэт
- Гендарныя перспектывы
- Глабальная сетка людзей, якія жывуць з ВІЧ
- Клуб дзелавых жанчын, Брэст
- Ла Страда Беларусь
- Людзі ПЛЮС
- Міжнароднае асветніцкае грамадскае аб’яднанне «АКТ»
- Міжнароднае грамадскае аб’яднанне па навукова-даследчых і інфармацыйна-адукацыйных праграмах «Развіццё»
- «Міжнародны праект – Дзеці Чарнобыля»
- моладзевыя цэнтры
- Офіс па правах людзей з інваліднасцю
- Пазітыўны рух
- Прававая ініцыятыва
- Радзіслава
- Рэспубліканскае сацыяльнае грамадскае аб’яднанне «Твой шанс»
- Рэспубліканская асацыяцыя інвалідаў-калясачнікаў
- Рэспубліканскі валанцёрскі цэнтр
- Фонд «Добра»
- Цэнтр па прасоўванні правоў жанчын «Яе правы»
- Цэнтр экалагічных рашэнняў
- Human Constanta
- MamaPro
- ProWomen
- Street Medicine

**Прыватны сектар**:
A1, Cipla, EPAM, Itransition, Life:), МТС, KPMG, Oyper, PriorBank, SoftTeco, Viber, Wargaming

**Анлайнавыя і друкаваныя СМІ**

**Уразлівыя групы насельніцтва**

## МІЖНАРОДНЫЯ ПАРТНЁРЫ І ДОНАРЫ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Эстонія | Еўразійская эканамічная камісія | Еўрапейскі саюз | Глабальны экалагічны фонд | Германія |
| Глабальны фонд для барацьбы са СНІДам, туберкулёзам і малярыяй | Нарвегія | Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе | Польшча/ Польская дапамога | Рэспубліка Карэя |
| Расійская Федэрацыя | Швецыя/СІДА (Шведскае міжнароднае агенцтва супрацоўніцтва для развіцця) | Злучанае Каралеўства | Агенцтва Злучаных Штатаў па міжнародным развіцці | Сусветны банк |

## КРАІНАВАЯ ГРУПА ААН

**Структуры ААН, якія ўнеслі ўклад у дасягненне вынікаў у 2020 годзе:**

# ГЛАВА 1. КЛЮЧАВЫЯ ПАДЗЕІ Ў БЕЛАРУСІ

Пандэмія COVID-19 аказала сур'ёзнае ўздзеянне на сацыяльна-эканамічную сітуацыю і сітуацыю ў галіне правоў чалавека. З моманту рэгістрацыі першага выпадку захворвання ў лютым 2020 года пандэмія не толькі адабрала чалавечыя жыцці, але і прывяла да непасрэднай рызыкі зніжэння даступнасці медыцынскіх паслуг, такіх як паслугі, звязаныя з хранічнымі неінфекцыйнымі захворваннямі, паслугі па ахове здароўя маці, педыятрычныя паслугі, паслугі па ахове сексуальнага і рэпрадуктыўнага здароўя. Некаторыя ўразлівыя групы насельніцтва, такія як асобы, што ўтрымліваюцца пад вартай, пажылыя людзі і людзі з інваліднасцю, медыцынскія і сацыяльныя работнікі, якія знаходзяцца на перадавой барацьбы з пандэміяй, найбольш востра адчулі на сабе адмоўнае ўздзеянне ўспышкі захворвання. Акрамя таго, пандэмія COVID-19 негатыўна адбілася на сродках для існавання многіх уразлівых груп, такіх як беспрацоўныя, самазанятыя, работнікі нефармальнага сектара, жыхары сельскай мясцовасці і інш., а таксама ўзмацніла гендарную няроўнасць у некаторых сферах.



Акрамя таго, пандэмія COVID-19 аказала адмоўны ўплыў на эканоміку, якая, згодна афіцыйнай статыстыцы, паніжыла спад у 0,9%. Да фактараў, якія абумовілі такі спад, адносяцца збоі ў рабоце сектара падарожжаў і турызму, скарачэнне падатковых паступленняў, рэцэсія ў краінах – гандлёвых партнёрах, якая ўплывае на экспарт, нафтавыя крызісы, звязаныя з перабоямі ў пастаўках і зніжэннем міжнародных цэн на нафту, скарачэнне ўнутранага попыту і збоі ў рабоце вытворча-збытавых ланцугоў. У большай ступені адчулі на сабе ўздзеянне пандэміі малыя і сярэднія прадпрыемствы, самазанятыя і работнікі нефармальнага сектара, сярод якіх шмат жанчын, а таксама пэўныя галіны (напрыклад, гасцінічны бізнес і гандаль), якія мацней пацярпелі ад сацыяльнага дыстанцыравання і абмежаванняў на паездкі.

Згодна з глабальным дакладам аб устойлівым развіцці, апублікаваным у чэрвені 2020 года, Беларусь дасягнула амаль 79 % МУР, у выніку чаго краіна заняла 18-е месца ў спісе з 193 краін[1]. Падзеі мінулага года, уключаючы пандэмію COVID-19 і падзеі, што адбыліся пасля прэзідэнцкіх выбараў у жніўні, ствараюць новыя выклікі, асабліва з пункту погляду партнёрства ў мэтах развіцця. Далейшая работа і амбіцыйныя стратэгіі развіцця неабходныя для замацавання ўражальных вынікаў у сферы МУР. ААН у Беларусі цесна супрацоўнічае з ключавымі ўстановамі і партнёрамі з грамадзянскай супольнасці, што складаюць нацыянальную архітэктуру каардынацыі дасягнення МУР, а таксама з міжнароднымі донарамі, якія падтрымліваюць інавацыі ў галіне ўстойлівага развіцця. Гэта работа будзе працягвацца ў 2021 годзе і ў наступны перыяд для паскарэння рашэнняў у галіне развіцця, неабходных для поўнага дасягнення МУР.

---

*[1] Глабальны даклад аб устойлівым развіцці 2020 года, даступны па адрасе https://sdgindex.org/reports/sustainable-development-report-2020/, уяўляе сабой глабальную ацэнку прагрэсу краін у дасягненні МУР. Ён дапаўняе афіцыйныя паказчыкі МУР і добраахвотныя нацыянальныя агляды. У дакладзе выкарыстоўваюцца афіцыйныя паказчыкі МУР, адобраныя Статыстычнай камісіяй ААН, калі яны даступныя, а калі даных для афіцыйнага паказчыка недастаткова, даклад уключае іншыя паказчыкі ад афіцыйных і неафіцыйных пастаўшчыкоў даных у мэтах ліквідацыі прабелаў.*

# ГЛАВА 2. ПАДТРЫМКА РАБОТЫ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ПРЫЯРЫТЭТАЎ У ГАЛІНЕ РАЗВІЦЦЯ, АКАЗАНАЯ СІСТЭМАЙ РАЗВІЦЦЯ ААН У АДПАВЕДНАСЦІ З РАМАЧНАЙ ПРАГРАМАЙ СУПРАЦОЎНІЦТВА

## 2.1. Агляд вынікаў ажыццяўлення Рамачнай праграмы супрацоўніцтва

У 2020 годзе ў сувязі з пандэміяй COVID-19 работа ААН па прыярытэтных напрамках развіцця ў Беларусі была пераарыентаваная на аказанне падтрымкі краіне ў барацьбе з сацыяльна-эканамічнымі наступствамі пандэміі. Адразу ж пасля пачатку пандэміі краінавая група Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (КГААН) распрацавала План сацыяльна-эканамічных мер у адказ на COVID-19 пад загалоўкам «Ад эканамічных узрушэнняў да больш эфектыўнага аднаўлення», які змяшчаў у сабе комплекс прапануемых мер рэагавання на пандэмію і аднаўлення пасля яе ў кароткатэрміновай, сярэднетэрміновай і доўгатэрміновай перспектывах.

У рамках барацьбы з пандэміяй COVID-19 у Беларусі ААН засяродзіла сваю ўвагу на пяці асноўных напрамках: 1) службы і сістэмы аховы здароўя; 2) сацыяльная абарона і асноўныя паслугі; 3) эканамічныя меры рэагавання і аднаўленне эканомікі; 4) макраэканамічныя меры рэагавання і шматбаковае супрацоўніцтва; 5) сацыяльная згуртаванасць і ўстойлівасць супольнасцей. Асноўныя мэты гэтай работы вызначаны глабальнай стратэгіяй рэагавання ААН, якая прадугледжвае аказанне дапамогі краінам у рэалізацыі скаардынаваных і ўсёабдымных мер рэагавання ў галіне аховы здароўя, у ажыццяўленні палітыкі, накіраванай на вырашэнне сацыяльна-эканамічных, гуманітарных і праваабарончых праблем у кантэксце пандэміі, а таксама больш эфектыўнае аднаўленне пасля крызісу з дапамогай пабудовы «зялёнай» і інклюзіўнай эканомікі і лічбавых пераўтварэнняў.

Апрача дзейнасці, звязанай з рэагаваннем на пандэмію COVID-19, КГААН працягвала аказваць краіне падтрымку ў дасягненні МУР, мабілізуючы стратэгічнае фінансаванне і партнёрствы ў мэтах ажыццяўлення Павесткі дня на перыяд да 2030 года і сочачы за тым, каб прынцып «нікога не пакінуць у баку», а таксама стандарты ў галіне правоў чалавека і прынцыпы гендарнай роўнасці былі ў аснове работы ў галіне ўстойлівага развіцця. Мерапрыемствы, прысвечаныя 75-годдзю ААН у 2020 годзе, садзейнічалі актывізацыі дыскусій па пытаннях міжнароднага супрацоўніцтва і ролі ААН у рэалізацыі Павесткі дня на перыяд да 2030 года.

КГААН унесла практычны ўклад у распрацоўку праекта Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця на перыяд да 2035 года і іншых нацыянальных эканамічных, сацыяльных і экалагічных планаў і праграм у мэтах забеспячэння ўліку праблематыкі ўстойлівага развіцця, удзяліўшы асаблівую ўвагу патрэбнасцям уразлівых груп і гендарнай роўнасці. КГААН працягнула ўзаемадзеянне з нацыянальнай архітэктурай кіравання працэсам дасягнення МУР, у тым ліку з Нацыянальным каардынатарам па дасягненні МУР, Саветам па ўстойлівым развіцці, Парламенцкай рабочай групай па МУР і Партнёрскай групай, якая прадстаўляе няўрадавых партнёраў па працэсе развіцця, а таксама аказвала падтрымку

ва ўмацаванні патэнцыялу нацыянальнай статыстычнай службы ў мэтах адсочвання прагрэсу ў ажыццяўленні Павесткі дня на перыяд да 2030 года. КГААН таксама распрацавала і ўзгадніла з нацыянальнымі партнёрамі новы пяцігадовы стратэгічны план супрацоўніцтва з Рэспублікай Беларусь: Рамачную праграму супрацоўніцтва ААН у галіне ўстойлівага развіцця на 2021-2025 гады (РПААНСУР, таксама Рамачная праграма ААН або Рамачная праграма супрацоўніцтва).

У 2020 годзе КГААН прыступіла да паступовага пераходу да работы па наступных стратэгічных прыярытэтных напрамках, прадугледжаных праектам Рамачнай праграмы ААН: 1) пераход да «зялёнай» эканомікі для забеспячэння ўсёабдымнага і ўстойлівага росту; 2) арыентацыя на будучыя пакаленні: падлеткі і моладзь; 3) лічбавыя пераўтварэнні і сацыяльныя інавацыі; і 4) гендарная роўнасць у грамадстве. Многія вынікі, дасягнутыя ААН у 2020 годзе, пераклікаюцца з адным або некалькімі з гэтых стратэгічных прыярытэтаў і сфармуляваныя з улікам наступстваў пандэміі COVID-19 і неабходнасці больш эфектыўнага аднаўлення.

Разам з тым, у 2020 годзе завяршылася рэалізацыя Рамачнай праграмы ААН па аказанні дапамогі ў мэтах развіцця на 2016–2020 гады (РПААНДР) — праграмы, у рамках якой Беларусі была прадастаўлена міжнародная дапамога ў мэтах развіцця на суму 85 млн дол. ЗША ў галіне кіравання, эканамічнага развіцця, экалагічнай устойлівасці і развіцця чалавечага капіталу. Каля 20 структур ААН супрацоўнічалі з больш чым 20 міжнароднымі партнёрамі і дзясяткамі нацыянальных партнёраў — дзяржаўнымі ўстановамі нацыянальнага, рэгіянальнага і мясцовага ўзроўняў, арганізацыямі грамадзянскай супольнасці, прыватным сектарам і навуковымі коламі, каб падтрымаць Беларусь на шляху ўстойлівага развіцця.

Праведзеная ў 2019 годзе ацэнка вынікаў, дасягнутых у рамках рэалізацыі РПААНДР на 2016-2020 гады, паказала, што ААН ажыццяўляла сваю дзейнасць у адпаведнасці з нацыянальнымі прыярытэтамі і дасягнула вынікаў ва ўсіх тэматычных галінах. У той жа час у рамках наступнага цыкла супрацоўніцтва ў мэтах развіцця з Беларуссю ў 2021–2025 гадах КГААН было рэкамендавана наладзіць больш прадметны дыялог па стратэгічных пытаннях, забяспечыць лепшае фінансаванне сваёй дзейнасці, адвесці МУР цэнтральнае месца ў сваёй рабоце, зрабіць большы акцэнт на ўразлівых групах і ажыццяўленні прынцыпу «нікога не пакінуць у баку», умацаваць партнёрскія сувязі для дасягнення МУР, выкарыстоўваць перавагі больш інтэграванай Сістэмы развіцця ААН і аказваць падтрымку нацыянальным партнёрам у абмене інфармацыяй аб галіновых рашэннях і інавацыях з іншымі краінамі.

## 2.2. Прыярытэты, доўгатэрміновыя і кароткатэрміновыя вынікі, прадугледжаныя Рамачнай праграмай супрацоўніцтва

*Рэсурсы, выдаткаваныя на дасягненне МУР структурамі ААН у 2016–2020 гадах (сярэднія паказчыкі)*




*Якія МУР ААН дапамагала дасягнуць у 2020 годзе?*



**_Уразлівыя групы і бенефіцыяры, на паляпшэнне становішча якіх была накіравана работа ААН у 2020 годзе_**

## _Ажыццяўленне прынцыпу «нікога не пакінуць у баку»:_

_уразлівыя групы і бенефіцыяры, на паляпшэнне становішча якіх была накіравана работа ААН у 2020 годзе_

- Дзеці, падлеткі і моладзь, у тым ліку дзеці з асаблівымі адукацыйнымі патрэбнасцямі; непаўналетнія ў кантакце з законам; дзеці і падлеткі, якія засталіся без апекавання бацькоў і знаходзяцца ва ўстановах інтэрнатнага тыпу
- Працоўныя мігранты і беларускія мігранты, якія вярнуліся
- Асобы без грамадзянства, якія пражываюць у Беларусі
- Асобы, якія атрымалі статус бежанца і дадатковую абарону ў Беларусі
- Медыцынскія работнікі, якія знаходзяцца на перадавой барацьбы з пандэміяй
- Ключавыя групы насельніцтва і ўразлівыя групы ў кантэксце ВІЧ і туберкулёзу, уключаючы асоб, якія спажываюць наркотыкі, работнікаў секс-індустрыі і асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай .
- Прасіцелі прыстанішча і нерэгулярныя мігранты, у тым ліку тыя, што знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі
- Асобы, якія перажылі насілле ў сям’і, у тым ліку жанчыны і дзеці, пажылыя людзі, людзі з інваліднасцю
- Людзі з інваліднасцю, уключаючы дзяцей з інваліднасцю і асоб, якія знаходзяцца ва ўстановах інтэрнатнага тыпу
- Цяжарныя жанчыны, у тым ліку жыхары сельскай мясцовасці і жанчыны з інваліднасцю
- Жанчыны і мужчыны, якія пацярпелі ад пандэміі COVID-19, уключаючы пацыентаў з COVID-19
- Ахвяры гандлю людзьмі
- Асобы, якія ўтрымліваюцца пад вартай
- Пажылыя людзі
- Людзі, якія жывуць з ВІЧ
- Бяздомныя асобы
- Шматдзетныя сем’і
- Адзінокія бацькі з дзецьмі
- Анкалагічныя хворыя

[2] _У кантэксце перадачы ВІЧ пад ключавымі групамі насельніцтва разумеюцца групы, якія з прычыны спецыфічных мадэлей паводзін, спалучаных з павышанай рызыкай, падпадаюць пад большую рызыку заражэння ВІЧ незалежна ад тыпу эпідэміі або мясцовага кантэксту; пад уразлівымі групамі разумеюцца групы, якія асабліва ўразлівыя да ВІЧ-інфекцыі ў пэўных сітуацыях або кантэкстах._

## 2.2.1. Меры, прынятыя ААН у сувязі з пандэміяй COVID-19




Пандэмія COVID-19 стала сур'ёзным выклікам для ўсіх краін, уключаючы Беларусь. Яна пацягнула за сабой негатыўныя наступствы для сітуацыі ў галіне правоў чалавека і сацыяльна-эканамічнага становішча, наступствы, якія ААН імкнулася звесці да мінімуму. Апрача асоб, якіх непасрэдна закранула пандэмія, і іх сем'яў, у сітуацыі рызыцы апынуліся таксама больш шырокія слаі насельніцтва з-за зніжэння даступнасці паслуг аховы здароўя, адукацыі і сацыяльных паслуг. Жанчыны апынуліся ў больш уразлівым становішчы і ў большай ступені падпадалі пад рызыкі, паколькі ў Беларусі яны складаюць 85 працэнтаў медыцынскіх і сацыяльных работнікаў і часта нясуць большы цяжар дамашняй працы. Апрача таго, што ўсё грамадства ў цэлым сутыкнулася з вышэйназванымі цяжкасцямі, падзеі 2020 года таксама сведчаць аб тым, што ад сацыяльных праблем і праблем у галіне правоў чалавека, абумоўленых пандэміяй COVID-19, як правіла, у непрапарцыянальна большай ступені пакутуюць пэўныя групы, такія як беспрацоўныя (асабліва моладзь), самазанятыя, работнікі нефармальнага сектара, працоўныя-мігранты, бежанцы, прасіцелі прыстанішча, асобы без грамадзянства, асобы, якія ўтрымліваюцца пад вартай, насельніцтва невялікіх гарадоў, сем'і з дзецьмі (асабліва шматдзетныя і няпоўныя сем'і), дзеці, якія знаходзяцца ў спецыялізаваных установах, і людзі з інваліднасцю, у тым ліку тыя, што знаходзяцца ва ўстановах інтэрнатнага тыпу.

З самага пачатку пандэміі сістэма ААН адыгрывала значную ролю ў павышэнні эфектыўнасці мер рэагавання на нацыянальным узроўні. Ужо ў сакавіку 2020 года Пастаянны каардынатар ад імя краінавай групы ААН праінфармавала Урад аб рабоце ўстаноў, фондаў і праграм сістэмы ААН, накіраванай на павышэнне ўзроўню гатоўнасці і эфектыўнасці барацьбы з пандэміяй COVID-19, і прапанавала дадатковую дапамогу ў сферы медыцынскіх закупак, інфармацыйных кампаній і камунікацыі, планавання барацьбы з пандэміяй COVID-19 і мабілізацыі донарскіх рэсурсаў. З тых часоў краінавая група ААН працягвае аказваць надзвычайную дапамогу. СААЗ сумесна з Міністэрствам аховы здароўя выконвала ацэнку патрэбнасцей у мэтах вызначэння прыярытэтаў у медыцынскім забеспячэнні. Разам з іншымі ўстановамі (напрыклад, ПРААН, ЮНФПА і ЮНІСЕФ) яны ўдзельнічалі ў закупцы лекаў і ахоўных сродкаў за кошт сродкаў крэдыту Сусветнага банка, што дапамагло краіне перажыць першыя хвалі пандэміі. Паралельна з гэтым установы ААН, у прыватнасці МАГАТЭ, МАМ, ЮНЭЙДС, ПРААН, ЮНФПА, ЮНІСЕФ, УНЗ ААН і СААЗ, мабілізавалі новыя грантавыя сродкі і часткова пераарыентавалі бягучыя праекты для фінансавання закупак асноўных і жыццёва неабходных медыкаментаў для пастаўшчыкоў медыцынскіх і сацыяльных паслуг.

У мэтах аптымізацыі закупак на глабальным узроўні СААЗ ініцыіравала стварэнне цэнтральнага закупачнага партала забеспячэння, што садзейнічала далейшаму павышэнню эфектыўнасці каардынацыі закупачнай дзейнасці ўсіх устаноў ААН. Закупачная дзейнасць ААН у Беларусі была накіравана на задавальненне патрэб устаноў аховы здароўя і адукацыі, пагранічнай службы і пунктаў пропуску, устаноў інтэрнатнага тыпу для пажылых людзей, дарослых і дзяцей з інваліднасцю і праблемамі здароўя, дзіцячых дамоў і дамоў дзіцяці па ўсёй Беларусі.

Усё гэта стала магчымым дзякуючы шчодрай падтрымцы нашых шматбаковых і двухбаковых партнёраў, у тым ліку Еўрапейскага саюза, Глабальнага экалагічнага фонду (ГЭФ), Германіі, Глабальнага фонду для барацьбы са СНІДам, туберкулёзам і малярыяй, МЗС Нарвегіі, Польскай дапамогі, Расійскай Федэрацыі, Шведскага міжнароднага агенцтва супрацоўніцтва для развіцця (СІДА), Вялікабрытаніі, Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці (ЮСАІД), а таксама ўстаноў-рэзідэнтаў і нерэзідэнтаў ААН. Прыватныя кампаніі (Wargaming, Itransition, SoftTeco, Oyper, A1, MTC, Life:)) актыўна займаліся мабілізацыяй дадатковых рэсурсаў для забеспячэння нацыянальнай сістэмы аховы здароўя неабходнымі сродкамі індывідуальнай засцярогі (СІЗ).

Па просьбе ўрада ў красавіку 2020 года СААЗ накіравала ў Рэспубліку Беларусь тэхнічную місію экспертаў па барацьбе з COVID-19 і прадставіла комплекс рэкамендацый, якія выконваюцца ў цяперашні час. У маі 2020 года Пастаянны каардынатар прадаставіла інфармацыю аб новай Глабальнай рамачнай праграме Арганізацыі Аб’яднаных Нацый па непасрэдных сацыяльна-эканамічных мерах рэагавання на COVID-19, распрацаванай Сістэмай развіцця ААН. Акрамя таго, працуючы ў цесным супрацоўніцтве з міжнароднымі фінансавымі ўстановамі, краінавая група ААН у Беларусі стварыла мэтавую групу экспертаў па эканамічнай і сацыяльнай палітыцы, якая павінна была сфармуляваць кіруючыя ўказанні з улікам нацыянальных прыярытэтаў па барацьбе з сацыяльна-эканамічнымі наступствамі пандэміі COVID-19 у Беларусі. Акрамя таго, ААН сфармулявала набор доўгатэрміновых прыярытэтаў і ўключыла іх у План сацыяльна-эканамічных мер у адказ на COVID-19 у Беларусі. У адпаведнасці з глабальнымі напрамкамі дзейнасці Арганізацыі, ААН у Беларусі вяла барацьбу з пандэміяй COVID-19, засяродзіўшы сваю ўвагу на пяці асноўных напрамках: 1) службы і сістэмы аховы здароўя; 2) сацыяльная абарона і асноўныя паслугі; 3) эканамічныя меры рэагавання і аднаўленне эканомікі; 4) макраэканамічныя меры рэагавання і шматбаковае супрацоўніцтва; 5) сацыяльная згуртаванасць і ўстойлівасць супольнасцей.

## КАМПАНЕНТ 1: ЗДАРОЎЕ ПЕРШ ЗА ЎСЁ

*Структуры-ўдзельнікі: МАГАТЭ, МАМ, МСЭ, УВКПЧ, ЮНЭЙДС, ПРААН, ЮНФПА, УВКБ ААН, ЮНІСЕФ, УНЗ ААН, СААЗ*

### АСНОЎНЫЯ ВЫНІКІ



- Буйнамаштабныя закупкі найважнейшых сродкаў індывідуальнай засцярогі для ўмацавання патэнцыялу работнікаў, якія знаходзяцца на пярэднім краі барацьбы з пандэміяй.
- Забеспячэнне лабараторнымі сродкамі, матэрыяламі і абсталяваннем для ажыццяўлення дзейнасці.
- Навучанне персаналу па пытаннях лабараторнай дыягностыкі COVID-19, вядзення пацыентаў, інтэнсіўнай тэрапіі, дыягнастычных падыходаў і лячэння, прафілактычнай работы з дзецьмі ў школах.
- Надзвычайная фінансавая дапамога для падтрымкі асоб, якія маюць статус бежанца, карыстаюцца дадатковай абаронай у Беларусі, і тых, хто працуе ў сферы аховы здароўя.
- Кампаніі па інфармаванні пра важныя гігіенічныя навыкі, якія дазваляюць прадухіліць распаўсюджванне COVID-19: напрыклад, амаль 2,3 мільёнам чалавек былі разасланы паведамленні аб прафілактыцы COVID-19 у рамках нацыянальнай кампаніі «Чысты трэнд», якая была накіравана на прадастаўленне бацькам і спецыялістам інструментаў і інфармацыйных рэсурсаў для навучання дзяцей і падлеткаў гігіенічным навыкам, што абмяжоўваюць распаўсюджванне COVID-19.
- Забеспячэнне бесперабойнага аказання паслуг пагранічнага і мытнага кантролю.
- Запуск анлайн-школы для цяжарных жанчын і іх сем’яў.
- Ацэнка ўздзеяння COVID-19, інфармацыйна-растлумачальная работа і інфармаванне пра рызыкі.
- Спецыялізаваныя трэнінгі для ўрачоў і тэхнічнага персаналу па тэме «Прымяненне тэлекамунікацыйных сетак і абсталявання для патрэб тэлемедыцыны і электроннай аховы здароўя ў рамках барацьбы з COVID-19».
- Аказанне экспертнай падтрымкі Міністэрству аховы здароўя ў працэсе ацэнкі медыцынскіх патрэбнасцей і падрыхтоўкі крэдыту Сусветнага банка для медыцынскіх закупак. У рамках праекта «Экстраннае рэагаванне на COVID-19 у Рэспубліцы Беларусь» дзве ўстановы ААН падпісалі пагадненні аб пастаўцы медыцынскіх вырабаў і сродкаў індывідуальнай засцярогі на агульную суму 16,8 млн дол. ЗША. План закупак уключае 54 найменні медыцынскіх вырабаў і сродкаў індывідуальнай засцярогі.
- Экспертная падтрымка і тэхнічная дапамога аказваліся пры падрыхтоўцы стратэгічных планаў і праграм у галіне аховы здароўя.

## *Факты і лічбы па мерах рэагавання на пандэмію COVID-19, прынятых сістэмай аховы здароўя пры падтрымцы ААН*



**КАМПАНЕНТ 2: АБАРАНЯЮЧЫ ЛЮДЗЕЙ**

*Структуры-ўдзельнікі: МАМ, ФАА, УВКПЧ, ПРААН, ЕЭК ААН, ЮНФПА, УВКБ ААН, ЮНІСЕФ, ААН-Хабітат, СААЗ*

**АСНОЎНЫЯ ВЫНІКІ**



- Інфармацыйныя кампаніі па мерах засцярогі і паслугах падтрымкі, арыентаваныя на ўразлівыя групы насельніцтва (мігранты, сельскія жыхары, дзеці з інваліднасцю, жанчыны, пажылыя людзі, прасіцелі прыстанішча, асобы, якія атрымалі статус бежанца і дадатковую абарону ў Беларусі, асобы без грамадзянства, пажылыя людзі).
- Маніторынг і забеспячэнне бесперашкоднага доступу грамадзян на тэрыторыю Беларусі і да дзяржаўнай працэдуры вызначэння статусу бежанца, нягледзячы на звязаныя з пандэміяй COVID-19 абмежаванні на паездкі і перасячэнне меж.
- Аператыўная ацэнка патрэбнасцей арганізацый грамадзянскай супольнасці і дзяржаўных «крызісных пакояў», якія аказваюць дапамогу ахвярам дамашняга насілля. Аказанне падтрымкі арганізацыям грамадзянскай супольнасці ў прадастаўленні асноўных паслуг ахвярам дамашняга насілля, уключаючы юрыдычную дапамогу.
- 8 цыклаў аператыўнай ацэнкі сацыяльна-эканамічных наступстваў для сем’яў з дзецьмі.
- Ініцыятывы па нарошчванні патэнцыялу дзяржаўных устаноў у мэтах удасканальвання сацыяльных паслуг, якія аказваюцца ўразлівым групам насельніцтва (работнікі нефармальнага сектара, людзі з інваліднасцю, жанчыны, бежанцы, мігранты і іншыя групы), і пашырэння ахопу фінансавымі паслугамі (пераводы сродкаў у грашовай і натуральнай форме).
- Падтрымка партнёраў у пераходзе да выканання інфармацыйна-растлумачальнай работы і аказання ўзаемнай падтрымкі ў рэжыме анлайн.
- Падрыхтоўка сумеснага праекта ААН па ўмацаванні сістэмы аховы здароўя, удасканальванні сацыяльных паслуг і павышэнні ўстойлівасці супольнасцей праз развіццё практыкі дыстанцыйнага кансультавання з акцэнтам на першасную медыка-санітарную дапамогу.

## КАМПАНЕНТ 3: ЭКАНАМІЧНАЕ РЭАГАВАННЕ І АДНАЎЛЕННЕ

*Структуры-ўдзельнікі: ФАА, МАП, МАМ, МСЭ, ЮНКТАД, ПРААН, ЕЭК ААН, ЮНФПА, ЮНІСЕФ, ЮНІДА, ААН-жанчыны*

### АСНОЎНЫЯ ВЫНІКІ



- Ацэнка ўздзеяння пандэміі COVID-19 на беларускія малыя і сярэднія прадпрыемствы (МСП) у мэтах аказання больш адраснай дапамогі, садзейнічання іх аднаўленню і павышэння іх устойлівасці.
- Падтрымка лічбавай трансфармацыі арганізацый грамадзянскай супольнасці і МСП для адаптацыі да новых рэалій працы.
- Прамая фінансавая падтрымка бізнес-інкубатараў, кластарных ініцыятыў і сацыяльных прадпрыемстваў у рэгіёнах Беларусі.
- Меры па вызначэнні найбольш эфектыўных стратэгій адукацыі і прафесійнай арыентацыі падлеткаў і моладзі з мэтай падрыхтоўкі іх да эфектыўнага выхаду на рынак працы.
- Нарошчванне патэнцыялу ў галіне лічбавізацыі і рэгіянальнай інтэграцыі, напрыклад, параўнанне сфарміраванасці і гатоўнасці да лічбавізацыі рэгіянальных вытворча-збытавых ланцугоў.

## КАМПАНЕНТ 4: МАКРАЭКАНАМІЧНЫЯ МЕРЫ РЭАГАВАННЯ І ШМАТБАКОВАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

*Структуры-ўдзельнікі: ЕБРР, МФК, МАМ, ПРААН, ЕЭК ААН, ЮНФПА, ЮНІСЕФ, ЮНІДА, ААН-жанчыны, Сусветны банк*

### АСНОЎНЫЯ ВЫНІКІ



- Даследаванне ўплыву пандэміі на эканамічны рост, сацыяльныя выдаткі і развіццё прыватнага сектара.
- Распрацоўка агульных кіруючых прынцыпаў па барацьбе з пандэміяй COVID-19, што тычацца паляпшэння сувязі, ліквідацыі трансгранічных і іншых рызык, падтрымкі «зялёнага» і ўстойлівага аднаўлення.
- Садзейнічанне Ураду пры ўступленні ў СГА.
- Падрыхтоўка сумеснай праграмы ААН у мэтах садзейнічання ўліку праблематыкі ўстойлівага развіцця пры фарміраванні бюджэтаў з накіраваннем прыярытэтнай увагі на ўразлівыя групы насельніцтва.

## КАМПАНЕНТ 5: САЦЫЯЛЬНАЯ ЗГУРТАВАНАСЦЬ І ЎСТОЙЛІВАСЦЬ СУПОЛЬНАСЦЕЙ

*Структуры-ўдзельнікі: МАМ, МСЭ, УВКПЧ, ПРААН, УЗРБ ААН, ЕЭК ААН, ЮНФПА, УВКБ ААН, ЮНІСЕФ, ААН-Хабітат*

### АСНОЎНЫЯ ВЫНІКІ




- Кансультаванне па стратэгічных пытаннях, інфармацыйна-растлумачальная дзейнасць і камунікацыя ў мэтах барацьбы з наступствамі пандэміі COVID-19 у галіне правоў чалавека, з якімі сутыкаюцца ўразлівыя групы, асабліва асобы, што ўтрымліваюцца пад вартай, і людзі з інваліднасцю.
- Прамая дапамога ўразлівым групам насельніцтва, у тым ліку мігрантам, ахвярам гандлю людзьмі, прасіцелям прыстанішча, асобам, якія атрымалі статус бежанца і дадатковую абарону ў Беларусі, асобам без грамадзянства. Надзвычайная фінансавая дапамога ў памеры 28 000 дол. ЗША была аказана асобам, што маюць статус бежанца і карыстаюцца дадатковай абаронай у Беларусі, якія страцілі працу з-за COVID-19 або сутыкнуліся з медыцынскімі праблемамі ў сувязі з пандэміяй.
- Амаль паўмільёна чалавек атрымалі вычарпальную інфармацыю пра наступствы COVID-19 у кантэксце правоў працоўных і механізмаў абароны, што садзейнічала рашэнню праблемы нерэгулярнай міграцыі, зніжэнню ўразлівасці мігрантаў і гандлю людзьмі.
- 85 нелегальных мігрантаў, якія апынуліся ў бядотным становішчы, вярнуліся дадому; 44 ахвяры гандлю людзьмі і 85 беларусаў, якія былі вымушаны вярнуцца дадому ў 2020 годзе, атрымалі разнапланавую дапамогу ў рэінтэграцыі.
- Арыентаваныя на ўразлівыя групы насельніцтва кампаніі па павышэнні паінфармаванасці аб пытаннях, звязаных з COVID-19, у тым ліку аб праблеме дамашняга насілля падчас пандэміі.
- Экстранная рассылка SMS-паведамленняў уразлівым групам насельніцтва пры падтрымцы ўсіх трох аператараў мабільнай сувязі ў Беларусі з мэтай інфармавання ўразлівых груп пра COVID-19 і пра тое, дзе можна атрымаць кансультацыю і дапамогу.
- Аказанне медыцынскай/псіхасацыяльнай падтрымкі работнікам, якія знаходзяцца на передавой барацьбы з пандэміяй, а таксама дзецям і сем’ям.
- 693 спецыялісты ў галіне грамадскай аховы здароўя і адукацыі прайшлі навучанне па пытаннях інфармавання школьнікаў пра прафілактыку COVID-19, і па меншай меры 30 000 дзяцей і падлеткаў былі навучаны навыкам бяспечных паводзін.
- Апытанне «Моладзь і каранавірус» у мэтах выяўлення патрэбнасцей моладзі ў перыяд пандэміі COVID-19 у Беларусі.
- Ацэнка патрэбнасцей людзей, якія жывуць з ВІЧ, і ключавых груп насельніцтва, звязаных з ВІЧ, у кантэксце пандэміі COVID-19 з мэтай выяўлення патэнцыяльных прабелаў у рабоце, накіраванай на задавальненне іх медыцынскіх, сацыяльных і эканамічных патрэбнасцей.
- Забеспячэнне доступу да эканамічнай, прававой і медыцынскай падтрымкі для людзей, якія жывуць з ВІЧ, і ключавых груп насельніцтва, звязаных з ВІЧ.
- IT-рашэнні для валанцёрскіх сетак, прызначаныя для набору і навучання валанцёраў, а таксама кіравання іх работай, дазволілі аказаць больш за 80 000 паслуг найбольш пацярпелым групам насельніцтва.
- Тры новыя клінікі (дзве ў Віцебску і адна ў Мінску) аснашчаныя новымі раздатачнымі ўстройствамі для ахопу найбольшай колькасці пацыентаў апіёіднай замяшчальнай тэрапіяй (АЗТ); забяспечана бесперапыннасць лячэння васьмі пацыентаў, якія праходзяць АЗТ,

шляхам аплаты іх транспартных выдаткаў, звязаных са штодзённымі паездкамі ў суседнія гарады падчас каранцінных абмежаванняў у сувязі з пандэміяй COVID-19.

- Павышэнне ўстойлівасці гарадоў з выкарыстаннем вопыту, назапашанага ў рамках рэалізацыі бягучых праектаў у Гродне.
- Вывучэнне ўплыву пандэміі COVID-19 на гандаль наркотыкамі праз інтэрнэт у мэтах ацэнкі маштабаў гандлю і асартыменту наркотыкаў, даступных для набыцця праз інтэрнэт, а таксама вызначэння папулярных сацыяльных платформаў і каналаў для іх выкарыстання ў далейшых праграмах прафілактыкі ВІЧ і зніжэння шкоды.
- Ацэнка мер, прынятых урадавымі і няўрадавымі арганізацыямі ў рамках барацьбы з COVID-19 у Беларусі, з улікам абавязацельстваў, замацаваных у Канвенцыі ААН аб правах інвалідаў.

## АСНОЎНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ АБ ПАРТНЁРСКІХ СУВЯЗЯХ, ЗАДЗЕЙНІЧАНЫХ ААН У РАМКАХ БАРАЦЬБЫ З ПАНДЭМІЯЙ COVID-19

**ААН:**
шматлікія структуры ААН, якія маюць прадстаўніцтва ў Беларусі і не маюць яго, Сусветны банк.

**ШМАТБАКОВЫЯ І ДВУХБАКОВЫЯ ДОНАРЫ:**
ЕС, ГЭФ, Германія, Глабальны фонд, МЗС Нарвегіі, Польская дапамога, Рэспубліка Карэя, Расійская Федэрацыя, СІДА, Вялікабрытанія, ЮСАІД.

**ПРЫВАТНЫЯ КАМПАНІІ:**
A1, Itransition, Life:), МТС, SoftTeco, Oyper, Wargaming, Аграпрамсіла, ExpertSoft, Lesante, Sigmapolus, SV Maschinen.

**АРГАНІЗАЦЫІ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ І РЭЦЫПІЕНТЫ:**
Беларускае Таварыства Чырвонага Крыжа і яго філіялы па ўсёй краіне, Беларускі рух медыцынскіх работнікаў, «Міжнародны праект – Дзеці Чарнобыля», Гендарныя перспектывы, Радзіслава, БелАДДІіМІ, MamaPro, прыродаахоўныя няўрадавыя арганізацыі, установы аховы здароўя, установы адукацыі, сацыяльна-педагагічныя цэнтры і цэнтры дапамогі дзецям малодшага ўзросту, установы інтэрнатнага тыпу для людзей пажылога ўзросту, дарослых і дзяцей з інваліднасцю і праблемамі здароўя, дзіцячыя дамы і дамы дзіцяці, іншыя ўстановы, якія аказваюць медыка-сацыяльную дапамогу.

**ДЗЯРЖАЎНЫЯ ОРГАНЫ І ЎСТАНОВЫ:**
Беларускае таварыства лабараторнай медыцыны, Міністэрства аховы здароўя, Міністэрства адукацыі, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Міністэрства абароны, Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны статыстычны камітэт, Дзяржаўны пагранічны камітэт і Нацыянальны аэрапорт Мінск, Дзяржаўны мытны камітэт, Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій, Рэспубліканскі цэнтр экстраннай медыцынскай дапамогі, Рэспубліканскі цэнтр гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя.

### 2.2.2. Падтрымка ў дасягненні мэт устойлівага развіцця, аказаная ААН

На працягу ўсяго 2020 года краінавая група ААН працягвала актыўна ўдзельнічаць у рабоце па дасягненні Мэт устойлівага развіцця і падтрымлівала дзейнасць Нацыянальнага каардынатара па дасягненні МУР і Савета па ўстойлівым развіцці, цесна супрацоўнічала з членамі Партнёрскай групы. Пастаянны каардынатар ААН і структуры сістэмы ААН прынялі ўдзел ва ўсіх пасяджэннях Нацыянальнага савета па ўстойлівым развіцці ў 2020 годзе. Нацыянальнай архітэктуры кіравання працэсам дасягнення МУР была аказана экспертная і аператыўная падтрымка ў рамках сумеснага праекта ПРААН, ЮНФПА і ЮНІСЕФ. Краінавая група ААН аказала падтрымку Нацыянальнаму статыстычнаму камітэту Рэспублікі Беларусь з мэтай умацавання яго патэнцыялу па падрыхтоўцы актуальных, якасных і дакладных статыстычных даных, якія выкарыстоўваюцца ў якасці асновы для інфармацыйна-растлумачальнай работы і прыняцця рашэнняў, у тым ліку даных аб дзецях, жанчынах і людзях з інваліднасцю. ААН адзначыла незаменную ролю партнёрстваў у рабоце па дасягненні МУР, у тым ліку важнасць канструктыўнага ўдзелу ўсіх членаў Партнёрскай групы. ААН прызнае важнасць уліку меркаванняў прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці ў рамках работы па дасягненні МУР, а таксама прынцыпаў партнёрства і прынцыпу «нікога не пакінуць у баку». Супрацоўніцтва сістэмы ААН і нацыянальнай архітэктуры кіравання працэсам дасягнення МУР у мэтах павышэння паінфармаванасці грамадства аб МУР і лакалізацыі МУР, а таксама рэалізацыя інавацыйных стратэгій устойлівага развіцця на рэгіянальным узроўні застаюцца прыярытэтнымі задачамі на 2021 год.

Інфармацыйна-растлумачальная дзейнасць ААН была ў асноўным звязана з МУР і садзейнічала ўкараненню інавацый і мадэрнізацыі ў розных сферах, асабліва ў сацыяльнай сферы. Акрамя таго, КГААН рабіла акцэнт на тым, што, у той час як барацьба з пандэміяй COVID-19 і эканамічнае аднаўленне маюць ключавое значэнне, першачарговую ўвагу неабходна ўдзяляць патрэбнасцям уразлівых груп. У 2020 годзе ў рамках дзейнасці сістэмы ААН, прадугледжанай мандатамі розных структур, асноўная ўвага ўдзялялася «зялёнаму» росту, будучым пакаленням, асабліва дзецям і моладзі, гендарнай роўнасці і інклюзіўнасці, а таксама абароне правоў людзей з інваліднасцю, бежанцаў, мігрантаў і іншых уразлівых груп.

У 2019 годзе ў Нью-Ёрку прайшоў Саміт па клімаце, і праблемы навакольнага асяроддзя і змянення клімату былі прадметам актыўных дыскусій. ААН у Беларусі вітала новыя стратэгічныя меры, прынятыя краінай у мэтах скарачэння выкарыстання аднаразовага пластыку і дасягнення далейшага прагрэсу ў аднаўленні тарфянікаў. Адаптацыя да змянення клімату і змякчэнне яго наступстваў павінны заставацца нацыянальным прыярытэтам для Беларусі. Прыродна-арыентаваныя рашэнні праблемы змянення клімату, такія як аднаўленне тарфянікаў, укараненне ветраэнергетыкі, больш шырокае выкарыстанне электратранспарту, маюць вялікае значэнне і дазваляюць не толькі скараціць выкіды $CO_2$ і захаваць нацыянальныя рэсурсы, але і выканаць міжнародныя абавязацельствы, якія ёсць у Беларусі як у члена міжнароднай супольнасці.

КГААН прыняла актыўны ўдзел у распрацоўцы Дарожнай карты па забеспячэнні ўсебаковага ўліку пытанняў старэння насельніцтва ў Беларусі і Нацыянальнай стратэгіі актыўнага даўгалецця да 2030 года. Удзяляючы асаблівую ўвагу праблеме насілля ў дачыненні да жанчын, структуры ААН працягвалі аказваць падтрымку ў распрацоўцы комплекснага падыходу да папярэджання насілля ў сям'і, імкнучыся наладзіць узорнае супрацоўніцтва паміж рынкам працы, сацыяльнымі службамі і Міністэрствам унутраных спраў. Што тычыцца сем'яў і становішча жанчын на працоўным месцы, то ААН прадставіла ў Беларусі некаторыя з найбольш інавацыйных замежных мадэлей гендарна- і сямейна-арыентаваных рабочых месцаў, якія ўжо былі пераняты кампаніямі прыватнага сектара. Яшчэ адным прыярытэтам з'яўляецца прыняцце нацыянальнай канцэпцыі правасуддзя ў дачыненні да дзяцей і ўкараненне новых метадаў аднаўленчага правасуддзя ў дачыненні да непаўналетніх правапарушальнікаў.

Іншыя прыклады работы, праробленай ААН за апошні год, уключаюць работу па барацьбе з ВІЧ/СНІДам, бясплатную юрыдычную дапамогу, а таксама работу па пытаннях міграцыі і правах бежанцаў. Беларусь наблізілася да далучэння да Канвенцыі ААН аб статусе апатрыдаў 1954 года і Канвенцыі ААН аб скарачэнні безграмадзянства 1961 года. Дасягненнем 2020 года з'яўляецца

таксама стварэнне краінавай сеткі ААН па міграцыі і пачатак яе функцыянавання, што дапамагло Беларусі прадставіць свой першы добраахвотны даклад аб рэалізацыі Глабальнага дагавора па міграцыі. У сферы аховы здароўя сістэма ААН працавала над прасоўваннем здаровага ладу жыцця, прафілактыкай неінфекцыйных захворванняў, аказвала падтрымку ў распрацоўцы Нацыянальнага плана выкаранення гепатыту С на 2019–2028 гады і распрацоўцы новых Нацыянальных кіруючых прынцыпаў лячэння туберкулёзу, якія прадугледжваюць усеагульны доступ да новых процітуберкулёзных прэпаратаў для ўсіх пацыентаў з лекава-ўстойлівым туберкулёзам. Гэта толькі некалькі прыкладаў ініцыятыў, якія маюць вырашальнае значэнне для дасягнення МУР, а таксама поспехаў, якіх ААН змагла дасягнуць у цесным супрацоўніцтве з членамі Савета па ўстойлівым развіцці і супольнасцю ўдзельнікаў дзейнасці па забеспячэнні ўстойлівага развіцця Беларусі, якія ўпарта працягвалі працаваць над выкананнем стратэгічных задач нягледзячы на пандэмію COVID-19 і іншыя цяжкасці.

ААН адданая падтрымцы аднаўлення, якое садзейнічае дасягненню МУР і рэалізацыі Павесткі дня на перыяд да 2030 года, з дапамогай «акселератараў» развіцця, або *платформаў паскарэння ўстойлівага развіцця*, якія могуць садзейнічаць наладжванню партнёрскіх сувязей і прыцягненню рэсурсаў у прыярытэтныя галіны. Чатыры платформы паскарэння ўстойлівага развіцця з'яўляюцца наступнымі:

1) Пераход да «зялёнай» эканомікі для забеспячэння ўсёабдымнага і ўстойлівага росту;

2) Арыентацыя на будучыя пакаленні: падлеткі і моладзь;

3) Лічбавыя пераўтварэнні і сацыяльныя інавацыі;

4) Гендарная роўнасць у грамадстве.

Гэтыя платформы паскарэння супадаюць са стратэгічнымі прыярытэтамі, прадугледжанымі новай Рамачнай праграмай супрацоўніцтва ААН і Беларусі на 2021–2025 гады. Яны павінны ўзмацняць дзеянне адно аднаго і ўзаемадзейнічаць паміж сабой для забеспячэння ўзаемадапаўняльнага і каталітычнага эфекту інвестыцый, звязаных з МУР. Іх сінергізм заснаваны не толькі на прапарцыянальнай увазе да эканамічных, экалагічных і сацыяльных аспектаў, але і на прынцыповай, скразной адданасці ажыццяўленню прынцыпу «нікога не пакінуць у баку» і прымяненню міжнародных стандартаў у галіне правоў чалавека і гендарнай роўнасці. Ніжэй прыведзена больш падрабязная інфармацыя аб выніках, дасягнутых сістэмай ААН у Беларусі ў 2020 годзе ў рамках платформаў паскарэння ўстойлівага развіцця і ажыццяўлення Павесткі дня на перыяд да 2030 года.

**1) Пераход да «зялёнай» эканомікі для забеспячэння ўсёабдымнага і ўстойлівага росту:**

- Укараненне рэсурсазберагальных і экалагічна чыстых метадаў вытворчасці на прамысловых прадпрыемствах для забеспячэння бесперапыннай рэалізацыі прэвентыўных экалагічных стратэгій у дачыненні да працэсаў, прадуктаў і паслуг з мэтай павышэння эфектыўнасці і зніжэння рызык для чалавека і навакольнага асяроддзя.
- Эксперыментальнае ўкараненне механізма ацэнкі ўздзеяння прадукцыі на навакольнае асяроддзе на некалькіх экспартна-арыентаваных прадпрыемствах для вымярэння экалагічных паказчыкаў тавару або паслугі на працягу ўсяго жыццёвага цыкла.
- Ініцыіраванне праектнай дзейнасці па ўключэнні патэнцыялу тэхналогій чацвёртай прамысловай рэвалюцыі для арганізацыі «разумнай» вытворчасці. Гэтыя тэхналогіі, якія пашыраюць межы паміж фізічным, лічбавым і біялагічным светамі, дапамогуць стварыць вытворчыя сістэмы, здольныя ў рэжыме рэальнага часу рэагаваць на зменлівыя патрабаванні і ўмовы на прадпрыемстве і ў сетцы паставак, а таксама ўлічваць патрэбнасці кліентаў.
- Бесперапынная падтрымка «зялёнага» горадабудаўніцтва, распрацоўка і зацвярджэнне да рэалізацыі планаў «зялёнага» горадабудаўніцтва для Зэльвы, Гарадка, Кармы, Крычава.

- Непасрэдная падтрымка прадпрымальніцкіх ініцыятыў у рэгіёнах аказаная 11 установам па падтрымцы прадпрымальніцтва, 33 прадпрымальніцкім ініцыятывам, у тым ліку 8 кластарам і 24 сацыяльна значным ініцыятывам.
- Перагляд вызначаемага на нацыянальным узроўні ўкладу — міжнароднага абавязацельства краіны па барацьбе са змяненнем клімату — з яго павышэннем з 28 да 35 працэнтаў, уключаючы распрацоўку сцэнарыяў, якія прадугледжваюць пастаноўку больш маштабных задач па барацьбе са змяненнем клімату да 2030 года ў сектарах, на якія прыпадае найбольшы аб'ём выкідаў парніковых газаў у краіне: энергетыка, прамысловасць і выкарыстанне прадуктаў, сельская гаспадарка і адходы.
- Падтрымка распрацоўкі Нацыянальнага плана дзеянняў па захаванні і ўстойлівым выкарыстанні біялагічнай разнастайнасці на 2021–2025 гады.
- Падтрымка прававой рэформы, якая прадугледжвае правядзенне стратэгічнай экалагічнай ацэнкі і трансгранічнай ацэнкі ўздзеяння на навакольнае асяроддзе, уключаючы кансультацыі з грамадскасцю.
- Аказанне нарматыўна-метадалагічнай падтрымкі ў распрацоўцы пашпартоў «разумных» устойлівых гарадоў і развіцці партнёрстваў дзяржаўнага і прыватнага сектараў у якасці інструментаў дасягнення МУР.
- Удасканальванне нарматыўна-прававой базы і ўмацаванне апаратыўнага патэнцыялу ў галіне ядзернай і радыяцыйнай бяспекі.
- Павышэнне паінфармаванасці грамадскасці аб лясных пажарах у зоне адчужэння і аб выкарыстанні драўніны з моцна забруджаных раёнаў.



## Арыентацыя на будучыя пакаленні: падлеткі і моладзь

- Удасканальванне палітыкі і інстытуцыянальнай базы для забеспячэння сацыяльнай інтэграцыі дзяцей з інваліднасцю, у тым ліку шляхам прыняцця наступных мер:
    - 40 міжраённых цэнтраў дапамогі дзецям малодшага ўзросту рэарганізаваныя ў Нацыянальную сістэму дапамогі дзецям малодшага ўзросту, персанал якой навучаны выкарыстанню ўніверсальных шкал і інструментаў скрынінгу, дзякуючы чаму дадзеная паслуга зараз даступная ў кожным рэгіёне Беларусі.
    - У партнёрстве з Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэтам адкрыты Нацыянальны рэсурсны цэнтр развіцця і навучання дзяцей малодшага ўзросту, які аказвае метадычную падтрымку ўкаранення інавацыйных падыходаў да забеспячэння якаснай адукацыі і навучання для дзяцей малодшага ўзросту з асаблівымі патрэбнасцямі ў навучанні і затрымкамі развіцця.

- 155 спецыялістаў і 30 прыёмных бацькоў у Гомельскай вобласці атрымалі навыкі, якія дазваляюць аптымальным чынам арганізаваць работу з сем'ямі і аказваць падтрымку дзецям малодшага ўзросту, у тым ліку дзецям з інваліднасцю.
    - 27 дзяцей з інваліднасцю, якія засталіся сіротамі або без апекавання бацькоў, адданыя ў прыёмныя сем'і, а трое вернутыя ў біялагічныя сем'і.
- Удасканальванне навыкаў падлеткаў і моладзі ў галіне валанцёрскай работы, лідарства, крытычнага мыслення і паляпшэння псіхічнага здароўя, у тым ліку з дапамогай наступных мер:
    - Больш за 200 валанцёраў і 70 каардынатараў Рэспубліканскага валанцёрскага цэнтра прайшлі навучанне па прафілактыцы COVID-19 і падтрымцы найбольш уразлівых груп насельніцтва.
    - 150 падлеткаў прайшлі навучанне навыкам лідарства і крытычнага мыслення, у выніку чаго было рэалізавана 14 сацыяльных ініцыятыў, накіраваных на забеспячэнне ўліку праблем, якія іх турбуюць, і пошук рашэнняў па такіх пытаннях, як гендарная роўнасць, беражлівыя адносіны да навакольнага асяроддзя і псіхічнае здароўе.
    - Новыя метады аднаўленчага правасуддзя ў дачыненні да падлеткаў, якія знаходзяцца ў канфлікце з законам, удасканаленая юрыдычная дапамога і механізмы накіравання да спецыялістаў.
    - Новыя інструменты і рэсурсы, якія дазваляюць бацькам і падлеткам змагацца з булінгам і псіхалагічным насіллем у школах, пераадольваць стрэс.
    - Перадавы міжнародны вопыт у галіне барацьбы з булінгам быў адаптаваны Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэтам і выкарыстаны пры распрацоўцы Нацыянальнай праграмы стварэння бяспечнага і спрыяльнага асяроддзя ў школах, якая рэалізуецца ў пілотным рэжыме ў 26 школах па ўсёй краіне. У бягучым навучальным годзе 11 500 падлеткаў 5–9 класаў праходзяць навучанне па выяўленні выпадкаў булінгу і барацьбе з імі.
- Інфармацыйна-асветніцкая кампанія па прадухіленні сексуальнай эксплуатацыі дзяцей і сексуальнага гвалту над дзецьмі, уключаючы работу спецыяльнага вэб-сайта smartparent.by.
- У выніку ўкаранення інструменту ацэнкі шматмернай дзіцячай беднасці для больш эфектыўнага размеркавання дзяржаўных выдаткаў на нацыянальным і рэгіянальным узроўнях урад прыняў рашэнне аб пашырэнні праграмы грашовых пераводаў для шматдзетных сем'яў у мэтах змякчэння ўздзеяння пандэміі COVID-19 і ўключыў у праграму яшчэ 6000 сем'яў.
- Інтэграцыя і адаптацыя дзяцей і падлеткаў-бежанцаў пры дапамозе работы з супольнасцямі, інклюзіўнай адукацыі і правядзення пазакласных мерапрыемстваў у моладзевых цэнтрах, а таксама ўмацавання патэнцыялу настаўнікаў і сацыяльных работнікаў.
- Павышэнне эфектыўнасці дзяржаўнага нагляду за рашэннем праблем, звязаных з неінфекцыйнымі захворваннямі, уключаючы распаўсюджанасць фактараў рызыкі, дэпрэсіі і задаволенасць пацыентаў першаснай медыка-санітарнай дапамогай.
- Распрацоўка анлайнавага вучэбнага модуля па планаванні сям'і для студэнтаў-медыкаў і медыцынскіх работнікаў.
- Падтрымка распрацоўкі новых клінічных рэкамендацый па матывацыйным кансультаванні персаналу сістэмы першаснай медыка-санітарнай дапамогі па пытаннях барацьбы з асноўнымі фактарамі рызыкі, якія садзейнічаюць развіццю неінфекцыйных захворванняў (курэнне, злоўжыванне



алкаголем, атлусценне) і асноўных неінфекцыйных захворванняў (цукровы дыябет 2 тыпу, сардэчна-сасудзістыя захворванні, хранічная абструктыўная хвароба лёгкіх).

- Распрацаваны і зацверджаны для рэалізацыі новы Нацыянальны план выкаранення гепатыту С на 2020–2028 гады.
- Удасканалена прымяненне тэхналогій і метадаў дыягностыкі раку і прамянёвай тэрапіі.

## Лічбавыя пераўтварэнні і сацыяльныя інавацыі



- Падтрымка лічбавай трансфармацыі МСП.
- Апублікаваны Дапаможнік па лічбавых рашэннях для малых і сярэдніх прадпрыемстваў, які змяшчае практычныя рэкамендацыі па лічбавізацыі бізнесу і па лічбавых рашэннях для няўрадавых арганізацый.
- Кансультацыйныя паслугі па пытаннях кібербяспекі і насілля ў інтэрнэце.
- Садзейнічанне нацыянальнаму дыялогу і абмену перадавым вопытам з іншымі краінамі па пытаннях стварэння «разумных» устойлівых гарадоў.
- Непасрэднае садзейнічанне ва ўніфікацыі фармату даных і працэсаў абмену данымі ў «разумных» гарадах, а таксама ў распрацоўцы неабходных тэхнічных стандартаў.

## Гендарная роўнасць у грамадстве

- Удзел ААН у распрацоўцы шостага Нацыянальнага плана дзеянняў па забеспячэнні гендарнай роўнасці на 2021–2025 гады ў супрацоўніцтве з Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны. Нацыянальны план дзеянняў забяспечвае важную пляцоўку для сумеснай работы ААН і нацыянальных улад у мэтах барацьбы з традыцыйнымі стэрэатыпамі, ліквідацыі гендарнага разрыву ў аплаце працы, які павялічваецца, пашырэння эканамічных правоў і магчымасцей жанчын, забеспячэння гендарна-арыентаванай аховы здароўя, уключаючы ліквідацыю гендарнага разрыву ў чакаемай працягласці жыцця і рэпрадуктыўным здароўі, а таксама выпрацоўкі аператыўных і комплексных рашэнняў па барацьбе з насіллем у сям’і.
- Укараненне сістэмы ацэначных лістоў КГААН, якая ўяўляе сабой сістэму падсправаздачнасці, што дазваляе ацаніць эфектыўнасць уліку гендарнай праблематыкі ў ААН і ўдасканаліць працэсы планавання, каардынацыі, распрацоўкі праграм і дасягнення вынікаў у мэтах забеспячэння гендарнай роўнасці і пашырэння правоў і магчымасцей жанчын на ўзроўні краіны. Паказчыкі за 2020 год сведчаць аб устойлівым прагрэсе, дасягнутым з 2017 года: удасканалены працэсы ўліку гендарнай праблематыкі ў рамках праекта Рамачнай праграмы Арганізацыі Аб’яднаных Нацый па супрацоўніцтве ў галіне ўстойлівага развіцця на 2021–2025 гады, працэсы сумеснага складання праграм, маніторынгу і ацэнкі, а таксама ўнутраныя механізмы каардынацыі па пытаннях гендарнай роўнасці.




- «Дарожная карта» па эксперыментальным укараненні на прыватных і дзяржаўных прадпрыемствах мадэлі працоўнага месца, якое забяспечвае камфортныя ўмовы працы для бацькоў.

- Анлайн-курс навукова-абгрунтаванай асветы ў сферы здароўя для цяжарных жанчын і іх сем'яў, які ў перспектыве могуць прайсці 80 000 цяжарных жанчын па ўсёй краіне, у тым ліку жанчыны, якія пражываюць у сельскіх раёнах, з мэтай паляпшэння зыходаў родаў для маці і нованароджаных.
- Першы цыкл аператыўнай гендарнай ацэнкі ўплыву пандэміі COVID-19 на жанчын і дзяўчынак, выкананы на ранніх стадыях пандэміі ў Беларусі, пацвердзіў высокую долю жанчын сярод работнікаў, якія знаходзяцца на перадавой барацьбы з пандэміяй, і ўзрослы аб'ём неаплачваемай працы, што выконваецца жанчынамі.
- Шэраг мерапрыемстваў у рамках Тыдня бізнесу і кар'еры для жанчын, якія жадаюць адкрыць сваю справу і/або прасунуцца па кар'ернай лесвіцы ў перыяд пандэміі COVID-19. У рамках гэтага тыдня 400 бенефіцыяраў прынялі ўдзел у семінарах па нарошчванні патэнцыялу з удзелам экспертаў, на вучэбных занятках і мерапрыемствах па наладжванні сувязей, трэнінгах па фарміраванні камунікатыўных навыкаў і сустрэчах з жанчынамі, якія з'яўляюцца ўзорам для пераймання.
- Семінар-практыкум па выпрацоўцы творчых ідэй, накіраваны на аказанне дапамогі жанчынам у пераасэнсаванні іх прадуктаў/паслуг або распрацоўцы новых у мэтах адкрыцця і паспяховага вядзення бізнесу.
- Адукацыйная праграма для жанчын-прадпрымальніц, якая ўключае анлайн-семінары і мерапрыемствы па наладжванні сувязей.

## Правы чалавека і прынцып «нікога не пакінуць у баку»

- Інфармацыйна-асветніцкая кампанія па барацьбе са стыгматызацыяй ахвяр гандлю людзьмі, якая ахапіла па меншай меры 17 000 чалавек у Беларусі і пашырыла магчымасці па асвятленні пытанняў міграцыі і гандлю людзьмі ў сродках масавай інфармацыі.
- Інфармацыйны канал у Вайберы і набор стыкераў «Кот-падарожнік», якія дазваляюць даць прыкладна 25 000 беларусаў просты доступ да актуальнай інфармацыі аб бяспечных паездках, бяспечным знаходжанні за мяжой, а таксама гандлі людзьмі, у тым ліку ў кантэксце пандэміі COVID-19.
- 5775 чалавек скарысталі тэлефонныя і тэкставыя паслугі агульнанацыянальнай гарачай лініі па пытаннях бяспечнай міграцыі і паездак за мяжу.
- Пачатак будаўніцтва спецыялізаванага цэнтра размяшчэння мігрантаў для павышэння эфектыўнасці кіравання міграцыяй, у тым ліку ў дачыненні да нерэгулярных мігрантаў і ўразлівых груп мігрантаў.
- Створана і функцыянуе краінавая сетка ААН па міграцыі, прызначаная аказаць дапамогу Беларусі ў распрацоўцы і рэалізацыі плана дзеянняў у галіне міграцыі.
- Бясплатная юрыдычная дапамога аказана 1543 асобам (1054 жанчыны, 489 мужчын), у тым ліку людзям з інваліднасцю, ахвярам дамашняга насілля і іншым уразлівым асобам.
- 67 членаў (40 жанчын, 27 мужчын) грамадзянскіх і дзяржаўных назіральных камісій, якія ажыццяўляюць нагляд за месцамі ўтрымання пад вартай, прынялі ўдзел у мерапрыемствах па нарошчванні патэнцыялу і абмене вопытам.
- Інфармацыйна-асветніцкая дзейнасць па садзейнічанні больш шырокаму выкарыстанню альтэрнатыў утрыманню пад вартай.
- Усебаковы і сістэматычны аналіз дзеючых рэкамендацый у галіне правоў чалавека, вынесеных органамі і механізмамі ААН, у мэтах распрацоўкі новага нацыянальнага плана дзеянняў у галіне правоў чалавека.
- Аналіз і экспертная ацэнка палітыкі ў дачыненні да наркотыкаў у Беларусі, яе праваабарончых аспектаў, сістэмы аказання бясплатнай юрыдычнай дапамогі ў Беларусі.
- Беларусь паведаміла аб сваім намеры далучыцца да Канвенцыі ААН аб статусе апатрыдаў 1954 года і Канвенцыі ААН аб скарачэнні безграмадзянства 1961 года.
- Працяг інфармацыйна-асветніцкай работы ў рамках Глабальнага плана дзеянняў па выкараненні безграмадзянства к 2024 году, уключаючы пацвярджэнне намеру Беларусі далучыцца да Канвенцыі 1954 года аб статусе апатрыдаў і Канвенцыі ААН 1961 года аб скарачэнні безграмадзянства (чакаецца ў 2021 годзе), у адпаведнасці з абавязацельствамі,

прынятымі падчас этапу пасяджэнняў высокага ўзроўню па пытанні аб безграмадзянстве, арганізаванага ў кастрычніку 2019 года УВКБ ААН.

- Уразлівым асобам без грамадзянства прадастаўлена бясплатнае юрыдычнае кансультаванне і фінансавая дапамога УВКБ ААН для аплаты дзяржаўных пошлін, неабходных для падачы заявы на атрыманне беларускага грамадзянства і атрымання дазволу на пастаяннае пражыванне, дзякуючы чаму 111 з іх змаглі вырашыць пытанне аб натуралізацыі і легалізаваць сваё знаходжанне ў Беларусі.
- Іншаземцам, якія жадаюць хадайнічаць аб прадастаўленні абароны ў Беларусі (у тым ліку затрыманым нерэгулярным мігрантам), дадзены бесперашкодны доступ на тэрыторыю Беларусі і да дзяржаўнай працэдуры вызначэння статусу бежанца, дзякуючы чаму кожны чалавек мае магчымасць рэалізаваць сваё ўніверсальнае права на атрыманне прыстанішча ў краіне.
- У супрацоўніцтве з арганізацыямі грамадзянскай супольнасці ў Мінску праводзіцца тэсціраванне на ВІЧ асоб без пэўнага месца жыхарства, што дазваляе аказаць дапамогу прадстаўнікам самай малапрыметнай уразлівай групы ў кантэксце пандэміі COVID-19.
- Ацэнка патрэбнасцей і праблем, якія ўскладняюць доступ асоб, якія спажываюць новыя псіхаактыўныя рэчывы і стымулятары амфетамінавага рада, да паслуг прафілактыкі ВІЧ, новы нацыянальны клінічны пратакол па лячэнні расстройстваў здароўя ў прадстаўнікоў дадзенай уразлівай групы.
- Інфармацыйна-асветніцкая дзейнасць у абарону асноватворных каштоўнасцей ААН, у рамках якой усе партнёры былі ў чарговы раз праінфармаваны аб стандартах, замацаваных у міжнародным праве; падтрымлівалася рэгулярнае ўзаемадзеянне з дзяржаўнымі органамі па пытаннях, звязаных з існуючымі ў іх міжнароднымі абавязацельствамі ў галіне правоў чалавека, а таксама агучваліся заклікі да расследавання ўсіх меркаваных выпадкаў парушэнняў правоў чалавека.

## Ключавыя праблемы

У 2020 годзе паўстала некалькі праблем, у сувязі з якімі прагрэс ва ўстойлівым развіцці запаволіўся, а структуры ААН і нацыянальныя і міжнародныя партнёры былі вымушаны перагледзець свае падыходы і метады работы. Наступствы складаных падзей, якія адбыліся ў свеце і Беларусі ў 2020 годзе, працягнуць аказваць уплыў на работу ААН у наступныя гады. Да ліку праблем, якія неабходна будзе вырашыць пасля 2020 года, адносяцца наступныя:

- Пандэмія COVID-19, яе шырокае сацыяльна-эканамічнае ўздзеянне, асабліва на найбольш уразлівыя групы насельніцтва, а таксама абмежаванні ў плане аператыўнай дзейнасці структур ААН і іх партнёраў.
- Аслабленне механізмаў абароны правоў чалавека і вяршэнства права, звужэнне прасторы для дзейнасці грамадзянскай супольнасці, што адаб'ецца на здольнасці Беларусі выконваць свае міжнародныя абавязацельствы і дасягаць мэты развіцця.
- Змены ў сацыяльна-палітычным становішчы і замаруджванне эканамічнага росту, якія могуць паставіць пад пагрозу дасягненні краіны ў галіне ўстойлівага развіцця.
- Імклівае развіццё анлайн-тэхналогій, якія сталі неад'емнай часткай штодзённага жыцця людзей, і адсутнасць навыкаў, асабліва ў прадстаўнікоў уразлівых груп, што дазваляюць адаптавацца да больш шырокага выкарыстання тэхналогій у рамках работы, вучобы, аказання паслуг, камунікацыі і г.д.
- Прабелы ў палітыцы грамадскай аховы здароўя, у тым ліку звязаныя з фактарамі рызыкі развіцця неінфекцыйных захворванняў і іх лячэннем, першаснай медыка-санітарнай дапамогай, урачэбнай тайнай і лічбавымі рашэннямі.

## 2.3. Падтрымка партнёрстваў і фінансаванне Павесткі дня на перыяд да 2030 года



У 2020 годзе на падтрымку, што аказваецца ААН партнёрам, і фінансаванне работы па рэалізацыі Павесткі дня на перыяд да 2030 года паўплывалі дзве асноўныя падзеі: пандэмія COVID-19 і наступствы глабальнага эканамічнага спаду ў Беларусі[3]. Гэтыя падзеі працягнуць аказваць уплыў на характар дзейнасці ААН у наступныя гады. Паколькі ўрад прагназуе захаванне дэфіцыту бюджэту ў 2021–2022 гадах, прыцягненне сродкаў за кошт дзяржаўных пазык набывае асаблівую важнасць для прадухілення рэгрэсу ў дасягненні МУР. Для ажыццяўлення выплат па абслугоўванні дзяржаўнага доўгу ў 2021 годзе Міністэрства фінансаў плануе прыцягнуць 500 млн дол. ЗША за кошт крэдыту Расійскай Федэрацыі (ужо адобранага) і каля 475 млн дол. ЗША за кошт выпуску ўнутраных і знешніх аблігацый і іншых інструментаў. Акрамя таго, цяжар, звязаны з пагашэннем і абслугоўваннем запазычанасці, па-ранейшаму будзе значным (каля 3 млрд дол. ЗША ў год) на працягу наступных двух гадоў[4]. Улічваючы, што ў цяперашні час каля 70 працэнтаў выдаткаў, звязаных з дасягненнем МУР, фінансуецца за кошт дзяржаўных сродкаў, велізарнае значэнне будуць мець партнёрствы, здольныя забяспечыць прыцягненне дадатковых унутраных (г. зн. прыватных) і знешніх (прыватных і дзяржаўных у рамках афіцыйнай дапамогі ў мэтах развіцця) рэсурсаў. Важнае значэнне будзе таксама мець уклад у натуральнай форме, які могуць унесці арганізацыі грамадзянскай супольнасці і іншыя ўстановы.

У 2020 годзе ААН у Беларусі працавала над умацаваннем нацыянальнага патэнцыялу ў галіне фінансавання развіцця, у тым ліку шляхам садзейнічання павышэнню эфектыўнасці сістэмы кіравання дзяржаўнымі фінансамі і пераходу ад фінансавання работы па дасягненні МУР да фінансавання, накіраванага на паскарэнне дасягнення МУР і забеспячэнне эфектыўнага сацыяльна-эканамічнага рэагавання на COVID-19. У гэтым кантэксце Аб'яднаным фондам для ажыццяўлення Павесткі дня ў галіне ўстойлівага развіцця на перыяд да 2030 года была адобрана сумесная праграма ўстаноў ААН у Беларусі «Прасоўванне новых інструментаў уліку праблематыкі ўстойлівага развіцця пры складанні бюджэтаў з акцэнтам на патрэбах уразлівых груп насельніцтва ў Беларусі» на 2020–2022 гады, якая будзе ажыццяўляцца ПРААН, ЮНІСЕФ, ЮНФПА і структурай «ААН-жанчыны». Рэалізацыя дадзенага праекта будзе садзейнічаць павышэнню тэмпаў росту і эфектыўнасці кіравання (МУР 1, 16 і 17), паляпшэнню экалагічных паказчыкаў (МУР 12–15) і сацыяльнай інтэграцыі з акцэнтам на патрэбнасці ўразлівых груп (МУР 3, 5 і прынцып «нікога не пакінуць у баку») пры дапамозе павышэння эфектыўнасці і дзейснасці сістэмы аказання дзяржаўных паслуг.

---

*[3] Падзенне ВУП склала 0,9 %. На стане на 1 студзеня 2021 года дзяржаўны доўг Беларусі складаў 37,3 % ВУП, уключаючы знешні дзяржаўны доўг (30,9 %). Па даных МВФ («Перспектывы развіцця сусветнай эканомікі», красавік 2021 г.), страта глабальнага ВУП склала 3,3 % у 2020 годзе.*

*[4] Перспектывы выкарыстання пазыковых сродкаў змяніліся пасля правядзення выбараў у Беларусі ў жніўні 2020 года. Хаця санкцыі прама не выключаюць магчымасці размяшчэння Беларуссю аблігацый на міжнародных рынках, дэ-факта некаторыя інвестыцыйныя банкі ўстрымліваюцца ад арганізацыі гэтага пытання. Верагоднасць прадастаўлення крэдытаў міжнароднымі фінансавымі ўстановамі таксама вельмі малая. Акрамя таго, унутраны рынак аблігацый, па ўсёй верагоднасці, таксама застанецца недастаткова ліквідным для Беларусі (напрыклад, унутраныя аблігацыі на суму 50 млн дол. ЗША, выпушчаныя ў пачатку жніўня 2020 года, былі прададзены ў аб'ёме 31,1 % ад агульнага (па стане на 1 студзеня 2021 года)). Што тычыцца знешніх крыніц фінансавання, то адзінымі жыццяздольнымі альтэрнатывамі ў кароткатэрміновай перспектыве бачацца Расійская Федэрацыя і Кітай. Выпуск замежных аблігацый таксама, па ўсёй верагоднасці, будзе арыентаваны на расійскі рынак.*

У сувязі з распаўсюджваннем пандэміі COVID-19 паўстала відавочная неабходнасць у стратэгічным узаемадзеянні з міжнароднымі фінансавымі ўстановамі (МФУ) і партнёрамі па развіцці ў мэтах рэалізацыі скаардынаваных мер рэагавання на краінавым узроўні і забеспячэння доступу да гэтак неабходных фінансавых рэсурсаў і надзвычайнага фінансавання. Як установы-рэзідэнты, так і ўстановы-нерэзідэнты актывізавалі партнёрскае ўзаемадзеянне ў рамках барацьбы з пандэміяй COVID-19 і рэалізацыі сумесных праграм у мэтах фінансавання Павесткі дня на перыяд да 2030 года.

У рамках Дзесяцігоддзя дзеянняў установы, фонды і праграмы ААН паспяхова аб'ядналі намаганні ў Беларусі для рэалізацыі рада праектаў, у тым ліку фінансуемага ЕС праекта «Прафілактыка неінфекцыйных захворванняў, прасоўванне здаровага ладу жыцця і падтрымка мадэрнізацыі сістэмы аховы здароўя Беларусі», вядомага як БЕЛМЕД (ПРААН, ЮНІСЕФ, ЮНФПА і СААЗ), фінансуемай Вялікабрытаніяй праграмы «Ад уразлівасці да жыццяздольнасці: прадухіленне насілля ў дачыненні да маладых жанчын і дзяцей праз пашырэнне правоў і магчымасцей на нізавым узроўні» (ЮНІСЕФ, ЮНФПА і ПРААН) і праекта «Падтрымка функцыянавання нацыянальнага інстытуцыянальнага механізма дасягнення МУР Беларусі» (фінансуецца і рэалізуецца ПРААН, ЮНІСЕФ і ЮНФПА).

Мабілізацыя рэсурсаў ажыццяўлялася як для рэалізацыі Павесткі дня на перыяд да 2030 года, так і для рэалізацыі распрацаванага ААН Плана сацыяльна-эканамічных мер у адказ на COVID-19 у Беларусі. Што тычыцца Плана сацыяльна-эканамічных мер у адказ на COVID-19, распрацаванага КГААН у 2020 годзе, то сумесная праграма «Пашырэнне правоў і магчымасцей жанчын і маладых уразлівых дзяўчынак і садзейнічанне развіццю МСП праз лічбавыя інавацыі ў Беларусі», падрыхтаваная ПРААН, ЮНФПА, ЮНІСЕФ і ЕЭК ААН, была выбрана для ўключэння ў каталог рашэнняў Шматбаковага партнёрскага мэтавага фонду ААН па барацьбе з пандэміяй COVID-19. СААЗ, ПРААН, ЮНІСЕФ і ЮНФПА распрацавалі сумесную праграму дзеянняў «Эфектыўнае аднаўленне за кошт умацавання сістэмы аховы здароўя, сацыяльных службаў і павышэння ўстойлівасці супольнасцей у Беларусі». Праект арыентаваны на стварэнне інструментаў аддаленага доступу да медыцынскіх і сацыяльных паслуг і павінен павысіць устойлівасць сістэмы аховы здароўя і сацыяльных службаў, а таксама ўмацаваць патэнцыял беларускага грамадства па рэагаванні на надзвычайную сітуацыю ў галіне грамадскай аховы здароўя ў сувязі з пандэміяй COVID-19.

Выяўлены новыя магчымасці ўзаемадзеяння і распрацаваны сумесныя падыходы да калектыўнага фінансавання работы па ажыццяўленні Павесткі дня на перыяд да 2030 года. Сумесны праект «Падтрымка правоў людзей з інваліднасцю ў Беларусі», распрацаваны ПРААН, ЮНІСЕФ, ЮНФПА і УВКПЧ, быў уключаны ў пералік праектаў, запланаваных да рэалізацыі Шматбаковым партнёрскім мэтавым фондам ААН, які падтрымлівае рэалізацыю Канвенцыі ААН аб правах інвалідаў (КПІ ААН). У рамках дадзенага праекта краіне будзе аказана падтрымка ў рэалізацыі заканадаўчых і палітычных мер у мэтах імплементацыі КПІ ААН у Беларусі. У снежні 2020 года праект «Падтрымка намаганняў Рэспублікі Беларусь у нацыяналізацыі і лакалізацыі Мэт устойлівага развіцця» быў адобраны да фінансавання Расійскай Федэрацыяй і затым прадстаўлены на дадатковае ўзгадненне зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі Беларусі.

Ніжэй прыведзена інфармацыя аб некаторых партнёрствах і адпаведных дасягненнях асобных структур ААН у 2020 годзе:

**МАМ** паспяхова разгарнула двухэтапную інфармацыйную кампанію, якая арыентавана на працоўных мігрантаў з  Беларусі, што шукаюць працу за мяжой або ўжо працуюць у Польшчы, Літве, Чэхіі, а таксама замежных грамадзян, што працуюць у Беларусі. У выніку гэтай дзейнасці, якая ажыццяўлялася ў партнёрстве з Агенцтвам ЗША па міжнародным развіцці (ЮСАІД) і Міністэрствам замежных спраў Нарвегіі, 497 568 чалавек атрымалі вычарпальную актуальную інфармацыю аб наступствах пандэміі COVID-19 для правоў працоўных, што садзейнічала дасягненню МУР 8, 10, 16 і 17. У рамках яшчэ аднаго мерапрыемства па барацьбе з пандэміяй COVID-19, рэалізаванага ў партнёрстве з ЮСАІД і Міністэрствам замежных спраў Нарвегіі, быў задзейнічаны вопыт МАМ у галіне лагістыкі, закупак і паставак і забяспечана абарона партнёраў з ліку дзяржаўных органаў і арганізацый грамадзянскай супольнасці шляхам паставак СІЗ і ахоўнага абсталявання,

што садзейнічала дасягненню МУР 3, 10, 16, 17. Яшчэ адным праектам МАМ, у рамках якога выкарыстоўваліся партнёрскія сувязі, стала сумесная ініцыятыва, рэалізаваная месенджарам Вайбер і вядомым беларускім ілюстратарам Міцем Післяком, у мэтах павышэння паінфармаванасці грамадскасці аб праблеме сучаснага рабства і зніжэння рызык пападання ў такую сітуацыю падчас паездак, што садзейнічала дасягненню МУР 10 і 17. У рамках яшчэ аднаго мерапрыемства па рэагаванні на пандэмію COVID-19, арыентаванага на мігрантаў, што апынуліся ў бядотным становішчы, 96 мігрантам, якія найбольш сур'ёзна пацярпелі ад пандэміі, была аказана дапамога ў падрыхтоўцы да ад'езду, у вяртанні і рэінтэграцыі па лініі Праграмы садзейнічання добраахвотнаму вяртанню і рэінтэграцыі, што фінансуецца Еўрапейскім саюзам.

У рамках свайго штогадовага флагманскага мерапрыемства — Форуму па «разумных» і ўстойлівых гарадах — **МСЭ** працягнуў даваць кансультацыі па тэхнічных і арганізацыйных пытаннях, звязаных з выкарыстаннем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій для забеспячэння ўстойлівага развіцця гарадоў, што садзейнічала дасягненню МУР 9 і 11. Дадзеная работа вялася ў партнёрстве з Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь, ААТ «Гіпрасувязь» і ПРААН.

**УВКПЧ** удасканальвала дзейнасць па аказанні прававой дапамогі групам, што знаходзяцца ва ўразлівым становішчы, у тым ліку жанчынам, якія сталі ахвярамі насілля, і людзям з інваліднасцю, што садзейнічала дасягненню МУР 16. Дадзеная работа праводзілася ў партнёрстве са мноствам зацікаўленых бакоў, такіх як Міністэрства юстыцыі, асацыяцыі адвакатаў, арганізацыі грамадзянскай супольнасці, «Гендарныя перспектывы» і Офіс па правах людзей з інваліднасцю.




**ЮНЭЙДС** супрацоўнічала з Глабальнай сеткай людзей, якія жывуць з ВІЧ, «Людзі ПЛЮС», дзяржаўным прадпрыемствам «Акадэмфарм», прыватнай кампаніяй «Cipla» ў мэтах выяўлення патэнцыяльных прабелаў у рабоце па задавальненні медыцынскіх, сацыяльных і эканамічных патрэбнасцей людзей, якія жывуць з ВІЧ, і звязаных з ВІЧ ключавых груп насельніцтва і аказання дапамогі Міністэрству аховы здароўя ў падрыхтоўцы і правядзенні двух цыклаў ацэнкі патрэбнасцей. Гэта работа садзейнічала дасягненню МУР 3 і 10 за кошт забеспячэння доступу да эканамічнай, прававой і медыцынскай падтрымкі для ключавых груп насельніцтва і ўразлівых груп. Акрамя таго, ЮНЭЙДС з дапамогай арганізацый грамадзянскай супольнасці «Пазітыўны рух» і «Людзі ПЛЮС» падрыхтавала і правяла два цыклы ацэнкі патрэбнасцей сярод адных і тых жа груп насельніцтва з мэтай выяўлення патэнцыяльных прабелаў у рабоце па задавальненні іх медыцынскіх, сацыяльных і эканамічных патрэбнасцей, што садзейнічала дасягненню МУР 3 і 10.

**ПРААН** былі прыняты неадкладныя меры па задавальненні патрэбнасцей дзяржаўных органаў у кантэксце пандэміі COVID-19 шляхам пераразмеркавання сродкаў і закупкі неабходных СІЗ, сродкаў дэзынфекцыі і тавараў медыцынскага прызначэння, што садзейнічала дасягненню МУР 3, 4, 10 і 17. Апрача дзяржаўных органаў (напрыклад, Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Міністэрства аховы здароўя, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, Міністэрства замежных спраў і Дзяржаўнага пагранічнага камітэта), ПРААН супрацоўнічала з Беларускім Таварыствам Чырвонага Крыжа ў мэтах пастаўкі абсталявання ўстановам-бенефіцыярам. Што тычыцца МУР 3, то ПРААН заключыла пагадненне з Міністэрствам аховы здароўя і Сусветным банкам аб прадастаўленні Беларусі крэдыту Сусветнага банка і забяспечыць буйнамаштабныя закупкі медыцынскага абсталявання для барацьбы з пандэміяй COVID-19. ПРААН таксама працягнула аказанне непасрэднай падтрымкі бізнес-ініцыятывам у рэгіёнах Беларусі, што будзе садзейнічаць дасягненню МУР 3, 4, 5, 8, 10, 11, 17. У выніку гэтай работы 12 пілотных раёнаў атрымалі тэхнічную дапамогу, якая дазволіць задзейнічаць прыватнае фінансаванне для

дасягнення МУР (Брэсцкая вобласць: Кобрын і Бяроза; Віцебская вобласць: Браслаў і Орша; Гомельская вобласць: Брагін, Жлобін і Хойнікі; Гродзенская вобласць: Ліда; Мінская вобласць: Барысаў і Маладзечна; Магілёўская вобласць: Быхаў і Клічаў). ПРААН таксама задзейнічала механізмы хуткага рэагавання і фінансавання для рашэння неадкладных сацыяльна-эканамічных праблем і паклала аснову для больш эфектыўнага аднаўлення пасля пандэміі, прыняўшы наступныя меры: даследаванні ў галіне МСП, нарошчванне патэнцыялу прадпрыемстваў, у тым ліку тых, якія ўзначальваюцца жанчынамі, падтрымка супольнасцей, а таксама ўмацаванне патэнцыялу ў галіне закупак для забеспячэння медыцынскім абсталяваннем і матэрыяламі. ПРААН у партнёрстве з Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь удзельнічала ў распрацоўцы Нацыянальнай стратэгіі інтэлектуальнай уласнасці і падрыхтоўцы праектных прапаноў па ўдасканаленні экасістэмы падтрымкі інавацый і інавацыйнага развіцця. У канцы 2020 года ПРААН пры падтрымцы Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях адкрыла Лабараторыю па паскарэнні ўстойлівага развіцця для пошуку рашэнняў, накіраваных на пабудову «зялёнай» і цыркулярнай эканомікі, прыцягненне моладзі, рэалізацыю лічбавых пераўтварэнняў і забеспячэнне гендарнай роўнасці, а таксама аказанне дапамогі краіне ў аднаўленні з улікам прынцыпаў «зялёнага» і ўстойлівага развіцця.

**ЕЭК ААН** у партнёрстве з мясцовымі органамі ўлады краін СНД, у тым ліку Беларусі, правяла анлайн рэгіянальны семінар па распрацоўцы пашпартоў «разумных» устойлівых гарадоў[5]. Семінар быў арганізаваны ЕЭК ААН у супрацоўніцтве з адміністрацыяй Гродна (Беларусь), Нур-Султана (Казахстан) і Бішкека (Кыргызстан), а таксама Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва Беларусі. Дадзенае мерапрыемства было накіравана на ўмацаванне патэнцыялу мясцовых і нацыянальных органаў улады ў галіне збору фактычных даных, неабходных для распрацоўкі палітыкі на ўсіх узроўнях, што садзейнічала дасягненню МУР 9 і 17. Акрамя таго, ЕЭК ААН у супрацоўніцтве з Міністэрствам эканомікі правяла яшчэ адзін семінар-практыкум па распрацоўцы і рэалізацыі нацыянальных стратэгій дзяржаўна-прыватнага партнёрства для садзейнічання яго выкарыстанню ў якасці інструменту дасягнення МУР, што дазволіць нарасціць патэнцыял беларускіх улад па прыцягненні прыватнага фінансавання і будзе садзейнічаць дасягненню МУР 9 і 17.

**ЮНФПА** ўнёс свой уклад у дасягненне МУР 1, 3, 5, 10, задзейнічаўшы партнёрскія сувязі з арганізацыямі грамадзянскай супольнасці. У якасці прыкладаў можна прывесці дапамогу, аказаную ЮНФПА валанцёрскай сетцы Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа ў распрацоўцы IT-рашэнняў для набору валанцёраў і каардынацыі іх дзейнасці, такіх як вэб-дадатак «Volunteers in Action», Сістэма Валанцёрскага партала на платформе Salesforce, а таксама іншыя меры, якія дазволілі аказаць больш за 80 000 паслуг групам насельніцтва, што ў найбольшай ступені пацярпелі ў выніку пандэміі COVID-19. У партнёрстве з сацыяльнай дабрачыннай арганізацыяй «MamaPro» і пры падтрымцы Міністэрства аховы здароўя ЮНФПА таксама распрацаваў анлайн-курс асветы ў сферы здароўя для цяжарных жанчын і іх сем'яў. Дзякуючы гэтаму курсу ў перспектыве да 80 000 цяжарных жанчын па ўсёй краіне, у тым ліку ў сельскіх раёнах, змогуць атрымаць навукова-абгрунтаваныя веды, што дазволіць палепшыць зыходы родаў для маці і нованароджаных.

Меры, прынятыя **УВКБ ААН** у рамках барацьбы з COVID-19, былі ў першую чаргу накіраваны на задавальненне патрэбнасцей падмандатных асоб падчас пандэміі ў партнёрстве з Беларускім Таварыствам Чырвонага Крыжа. У выніку гэтай дзейнасці асобы, якія страцілі працу або сутыкнуліся з праблемамі са здароўем, а таксама падмандатныя асобы з ліку медыцынскіх работнікаў у Беларусі былі забяспечаны ахоўнымі маскамі і сродкамі дэзынфекцыі (каля 10 000 шт.), а таксама атрымалі дадатковую фінансавую дапамогу (на агульную суму каля 28 000 дол. ЗША). Дадзеная работа садзейнічала дасягненню МУР 1, 3, 6, 8. Акрамя таго, у дадатак да гэтай работы была разгорнута тэматычная інфармацыйна-асветніцкая кампанія па інфармаванні падмандатных асоб пра пытанні, звязаныя з COVID-19, у рамках якой было выраблена і распаўсюджана 6000 лістовак з асноўнай інфармацыяй аб COVID-19 і магчымасцях атрымання дапамогі; у партнёрстве з ЮНФПА выраблены і распаўсюджаны (у тым ліку праз сацыяльныя сеткі і месенджары) інфармацыйныя матэрыялы

[5] *Праект «Стварэнне "разумных" устойлівых гарадоў у рамках рэалізацыі Павесткі дня ў галіне ўстойлівага развіцця на перыяд да 2030 года і Новай праграмы развіцця гарадоў у рэгіёне ЕЭК ААН», які фінансуецца за кошт сродкаў дванаццатага траншу па лініі Рахунка развіцця Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.*

аб дамашнім насіллі ў перыяд пандэміі COVID-19; а таксама арганізавана экстранная рассылка SMS-паведамленняў сярод падмандатных асоб пры падтрымцы ўсіх трох мабільных аператараў Беларусі (A1, MTS, Life:)) у мэтах інфармавання аб пандэміі COVID-19 і аб тым, куды можна звярнуцца па кансультацыю і дапамогу.

**ЮНІСЕФ** прыняў актыўныя меры падтрымкі нацыянальных сістэм аховы здароўя, адукацыі і сацыяльнай абароны для забеспячэння своечасовага і эфектыўнага рэагавання на распаўсюджванне пандэміі COVID-19 з акцэнтам на меры прафілактыкі і барацьбы з інфекцыяй, а таксама абарону медыцынскіх работнікаў, якія знаходзяцца на перадавой барацьбы з пандэміяй, спецыялістаў сістэм адукацыі і сацыяльнай абароны, што дазволіла ім аказваць якасную медыцынскую дапамогу і паслугі пацыентам, дзецям і сем’ям. ЮНІСЕФ унёс свой уклад у дасягненне МУР 3 шляхам пастаўкі больш за 600 000 адзінак СІЗ і больш за 2000 адзінак медыцынскага абсталявання за кошт сродкаў, прадастаўленых індывідуальнымі і міжнароднымі донарамі, а таксама кампаніямі прыватнага сектара (Wargaming, Itransition, SV Maschinen GmbH, Expert Soft Inc, Аграпрамсіла, Sigmapolus, Lesante), што дазволіла забяспечыць больш эфектыўную абарону 38 000 медыцынскіх работнікаў, якія аказваюць дапамогу інфіцыраваным COVID-19 пацыентам і дзецям. Для забеспячэння эфектыўнай рэспіраторнай падтрымкі пацыентаў, інфіцыраваных COVID-19, ЮНІСЕФ паставіў 140 кіслародных канцэнтратараў у бальніцы Мінска і шасці абласцей, а таксама пры садзейнічанні вядучых спецыялістаў Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі (БелМАПА) арганізаваў два нацыянальныя і адзін міжнародны вэбінар па правільным выкарыстанні кіслародных канцэнтратараў. Акрамя таго, у супрацоўніцтве з БелМАПА для 10 000 медыцынскіх работнікаў, якія знаходзяцца на перадавой барацьбы з пандэміяй і абслугоўваюць школы і ўстановы інтэрнатнага тыпу, арганізавана навучанне па распараджэнні рэсурсамі і прадастаўлены вучэбныя матэрыялы з інфармацыяй аб падыходах да дыягностыкі і лячэння COVID-19. ЮНІСЕФ таксама адыграў важную ролю ў развіцці навыкаў, унёсшы ўклад у дасягненне МУР 4, 5 і 13. Напрыклад, больш за 350 падлеткаў і 70 валанцёраў-каардынатараў Рэспубліканскага валанцёрскага цэнтра прайшлі навучанне па прафілактыцы COVID-19 і падтрымцы найбольш уразлівых груп насельніцтва, а таксама атрымалі навыкі лідарства і крытычнага мыслення. Акрамя таго, ЮНІСЕФ у партнёрстве з Рэспубліканскай калегіяй адвакатаў і арганізацыямі грамадзянскай супольнасці распрацоўваў новыя падыходы да аднаўленчага правасуддзя ў дачыненні да падлеткаў, якія знаходзяцца ў канфлікце з законам, укараняючы і апрабуючы паслугі адраснай падтрымкі ў чатырох сацыяльна-педагагічных цэнтрах па ўсёй краіне ў мэтах удасканальвання юрыдычнай дапамогі і механізмаў накіравання да спецыялістаў, у выніку чаго больш за 500 бацькоў атрымалі бясплатныя юрыдычныя кансультацыі праз чат-бот юрыдычнай дапамогі.

**ЮНІДА** прыняла меры, якія будуць садзейнічаць прыцягненню прыватнага фінансавання для дасягнення МУР. ЮНІДА ў партнёрстве з ЕС аказала дапамогу Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту, Міністэрству прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і Міністэрству эканомікі ў рамках ініцыятывы «ЕС за навакольнае асяроддзе» па стварэнні пілотных дэманстрацыйных прадпрыемстваў з рэсурсазберагальнай і экалагічнай вытворчасцю. У рамках гэтай ініцыятывы па меншай меры 24 кампаніі стануць членамі двух клубаў рэсурсазберагальнай і экалагічнай вытворчасці (2 індустрыяльныя паркі і/або свабодныя эканамічныя зоны), 15 экспертаў прайшлі навучанне па садзейнічанні ўкараненню метадаў рэсурсазберагальнай і экалагічнай вытворчасці на прамысловых аб’ектах. У выніку дадзеная ініцыятыва садзейнічала дасягненню МУР 9, 12, 13.

**УНЗ ААН** у партнёрстве з пастаўшчыкамі паслуг па барацьбе з ВІЧ унесла свой уклад у дасягненне МУР 3, 5, 10 шляхам ацэнкі патрэбнасцей і канкрэтных праблем, якія ўскладняюць доступ да паслуг па прафілактыцы ВІЧ; ацэнка была праведзена сярод людзей, якія спажываюць новыя псіхаактыўныя рэчывы і стымулятары амфетамінавага рада, у тым ліку ў трох гарадах, што далучыліся да Стратэгіі паскарэння мер па спыненні эпідэміі ВІЧ/СНІДу ў гарадах.

Структура **«ААН-жанчыны»** ў партнёрстве з Еўрапейскім саюзам у рамках праграмы «ЕС за гендарную роўнасць: разам супраць гендарных стэрэатыпаў і гендарна-абумоўленага насілля», што ажыццяўляецца сумесна з ЮНФПА, засяродзіла намаганні на ўмацаванні роўных правоў і магчымасцей для жанчын і мужчын праз змяненне сацыяльных уяўленняў і шкодных гендарных стэрэатыпаў, а таксама на павелічэнні ўдзелу мужчын у доглядзе. Больш таго, пры падтрымцы

ААН-жанчыны і ЮНФПА на ранніх этапах пандэміі ў Беларусі быў праведзены першы аператыўны гендарны аналіз уздзеяння COVID-19 на жанчын і дзяўчынак. ААН-жанчыны ў партнёрстве з ЮНІСЕФ падтрымала Нацыянальны статыстычны камітэт Рэспублікі Беларусь у распрацоўцы платформы візуалізацыі даных па паказчыках гендарнай роўнасці з мэтай паляпшэння грамадскага доступу і прадастаўлення аднаго акна для атрымання гендарных даных на нацыянальным узроўні.

## 2.4. Вынікі праграмы павышэння зладжанасці работы ўстаноў ААН: узгодненасць, эфектыўнасць і дзейснасць устаноў ААН

У рамках рэалізацыі рэформы Сістэмы развіцця ААН КГААН завяршыла падрыхтоўку новай Рамачнай праграмы ААН па супрацоўніцтве ў галіне ўстойлівага развіцця на 2021–2025 гады і працавала над карэкціроўкай сваіх праграм і планаў у зменлівым краінавым кантэксце. КГААН падтрымала пашырэнне супрацоўніцтва ў галіне аналізу, маніторынгу і справаздачнасці аб выніках і выкарыстоўвала вынікі аналізу для больш эфектыўнага ўзгаднення бягучых праграм з нацыянальнымі прыярытэтамі і забеспячэння агульнага разумення сістэмай ААН прыярытэтаў і новых праблем у Беларусі. КГААН удзяляла прыярытэтную ўвагу сумеснай рабоце па складанні праграм і мабілізацыі рэсурсаў для рэалізацыі стратэгічных ініцыятыў, арыентаваных на дасягненне МУР, і заклікала да далейшай работы па спрашчэнні і аб'яднанні працэдур, якія выконваюцца дапаможнымі падраздзяленнямі.

**Распрацоўка новай Рамачнай праграмы ААН супрацоўніцтва ў галіне ўстойлівага развіцця (РПААНСУР) на 2021–2025.** У рамках распрацоўкі новай РПААНСУР краінавая група ААН выканала аналіз канфігурацыі ўстаноў ААН у мэтах вызначэння сіл і сродкаў, якія неабходны для дасягнення вынікаў, прадугледжаных Рамачнай праграмай супрацоўніцтва, а таксама вызначэння новага складу КГААН, які дазволіў бы аб'яднаць патэнцыял усіх структур ААН, што прысутнічаюць у Беларусі і рэгіёне. З улікам вынікаў дадзенага аналізу 20 структур ААН — як тыя, што маюць прадстаўніцтва ў Беларусі, так і тыя, што не маюць яго, — узялі на сябе абавязацельствы па ажыццяўленні РПААНСУР. Вынікі аналізу таксама коратка выкладзены ў канцэптуальным дакуменце, які можа выкарыстоўвацца ў якасці дапаможніка, што дазваляе нацыянальным і міжнародным партнёрам лепш арыентавацца ў Сістэме развіцця ААН, эфектыўна выкарыстоўваць наяўны ў ААН патэнцыял і ствараць новыя тэматычныя партнёрствы і кааліцыі.

Поўны спіс структур, якія плануюць падпісаць РПААНСУР, уключае дваццаць арганізацый: ФАА, МАП, МАМ, МГЦ, МСЭ, УВКПЧ, ЮНЭЙДС, ЮНКТАД, ПРААН, УЗРБ ААН, ЕЭК ААН, ЮНФПА, ААН-Хабітат, УВКБ ААН, ЮНІСЕФ, ЮНІДА, УНЗ ААН, ЮНОПС, ААН-жанчыны і СААЗ. Установы ААН будуць непасрэдна садзейнічаць дасягненню вынікаў, прадугледжаных РПААНСУР, у рамках рэалізацыі сваіх будучых праграм, планаў работ і іншых механізмаў планавання.

**Падтрымка і кансультаванне па стратэгічных пытаннях**. Аптымізацыя сумеснага выкарыстання аналітычных рэсурсаў ААН і ўмацаванне партнёрскіх сувязей з урадавымі ўстановамі і арганізацыямі грамадзянскай супольнасці дазволілі павысіць эфектыўнасць падтрымкі і кансультавання па стратэгічных пытаннях. Структуры ААН выпрацавалі шэраг падрабязных рэкамендацый і каментарыяў да Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця на перыяд да 2035 года, нацыянальных праграм, стратэгій, канцэпцый і планаў у розных галінах, такіх як сацыяльна-эканамічнае развіццё, ахова навакольнага асяроддзя, ахова здароўя, дэмаграфія, адукацыя, занятасць, прадпрымальніцтва, моладзь і пажылыя людзі, прафілактыка ВІЧ і туберкулёзу, наркапалітыка, міграцыя, гендарная роўнасць, якія ў канчатковым выніку былі прыняты і, напэўна, паўплываюць на прагрэс Беларусі ў дасягненні МУР у наступныя гады.

**Сумесная распрацоўка праграм**. Калектыўнае ажыццяўленне рэформы Сістэмы развіцця ААН і пераарыентацыя сістэмы пастаянных каардынатараў на месцах дазволілі дасягнуць заўважнага прагрэсу ў плане ўзроўню і маштабаў дзейнасці, звязанай з сумеснай распрацоўкай праграм. Структуры ААН супрацоўнічалі больш эфектыўна, прадпрымаючы калектыўныя дзеянні па паскарэнні прагрэсу ў дасягненні нацыянальных Мэт устойлівага развіцця. Меры рэагавання на

пандэмію COVID-19 прадэманстравалі патэнцыяльныя магчымасці сумеснай работы, а таксама садзейнічалі пашырэнню магчымасцей для партнёрства і мабілізацыі рэсурсаў. Акрамя таго, расце інтарэс донараў да пераваг сумеснага складання праграм, аб чым сведчыць павелічэнне колькасці рашэнняў донараў аб накіраванні сродкаў на рэалізацыю сумесных ініцыятыў ААН.

Офіс Пастаяннага каардынатара ААН і некаторыя структуры ААН таксама прынялі ўдзел у рабоце Нацыянальнага савета па гендарнай палітыцы пры Савеце Міністраў, які з’яўляецца важнай платформай для супрацоўніцтва ААН, нацыянальных партнёраў і грамадзянскай супольнасці па пытаннях гендарнай роўнасці і садзейнічае ўстойліваму развіццю краіны. Аналагічным чынам ААН разам з урадавымі і няўрадавымі партнёрамі ўдзельнічае ў рабоце нацыянальных структур па каардынацыі мер барацьбы з ВІЧ/СНІДам на нацыянальным узроўні. Дасягненнем 2020 года таксама з’яўляецца стварэнне і пачатак функцыянавання краінавай сеткі ААН па міграцыі, якая аказала падтрымку Беларусі ў падрыхтоўцы першага добраахвотнага даклада аб рэалізацыі Глабальнага дагавора па міграцыі. Гэта сетка будзе і далей садзейнічаць распрацоўцы і ажыццяўленню плана дзеянняў у галіне міграцыі. Была аказана падтрымка ў распрацоўцы канцэпцыі міграцыйнай палітыкі ў Беларусі, а ўраду былі прадстаўлены абагульненыя каментарыі ўстаноў ААН.

**Сумесная аператыўная дзейнасць**. Што тычыцца аператыўнай дзейнасці, то КГААН актыўна ўдзельнічала ў распрацоўцы Стратэгіі аператыўнай дзейнасці новага пакалення (САД 2.0), якая прызначана аблягчыць стратэгічнае планаванне, кіраванне, маніторынг і справаздачнасць аб сумеснай падтрымцы ў ажыццяўленні праграм, якая аказваецца КГААН. Новая стратэгія была распрацавана з улікам існуючага аператыўнага становішча і патэнцыяльных праблем. У ёй адлюстраваны даволі ўмераны маштаб аператыўнай дзейнасці ААН у Беларусі і той факт, што ўстановы ААН, якія з’яўляюцца рэзідэнтамі, не мелі агульных памяшканняў, прычым некаторыя з іх размяшчаліся ў адных і тых жа будынках, а некаторыя мелі цалкам асобныя офісныя памяшканні. З-за такога становішча было складаней дабіцца эканоміі за кошт эфекту маштабу і распрацоўваць агульныя паслугі. Тым не менш распрацоўка і ўкараненне Стратэгіі аператыўнай дзейнасці дазволілі КГААН дамагчыся прыросту эфектыўнасці, мінімізаваць унутраныя аперацыйныя выдаткі і павысіць якасць паслуг, у тым ліку скараціўшы выдаткі на тавары і паслугі, што закупаюцца са знешніх крыніц. Гаворка ідзе пра такія агульныя паслугі, як арганізацыя мерапрыемстваў, паездкі, прыём гасцей, узгадненне ставак і кіраванне на аснове ўзгодненага падыходу да пераводу наяўных сродкаў. Агульная сума сэканомленых сродкаў склала каля 34 000 дол. ЗША. Эканомія была дасягнута за кошт правядзення агульных перагавораў па сумесных доўгатэрміновых пагадненнях, што дазволіла скараціць колькасць часу, выдаткаванага супрацоўнікамі, а таксама выпрацаваць агульную перагаворную пазіцыю, дзякуючы чаму была забяспечана максімальная рэнтабельнасць выдаткаў і павышана якасць паслуг. Станоўчым пабочным вынікам стаў таксама дух узаемадзеяння і дынаміка далейшага развіцця супрацоўніцтва паміж установамі.

Дадатная дынаміка ў супрацоўніцтве паміж структурамі ААН праявілася ў каардынацыі мер рэагавання на пандэмію COVID-19, звязаных з аказаннем краіне медыцынскай і сацыяльна-эканамічнай дапамогі і абаронай супрацоўнікаў ААН. Работа па першым напрамку ўключала сумесныя закупкі тавараў медыцынскага прызначэння і сродкаў індывідуальнай засцярогі, аказанне паслуг уразлівым групам насельніцтва; у рамках работы па другім напрамку быў рэалізаваны комплекс мер, уключаючы прыняцце КГААН Плана экстранных мерапрыемстваў і планаў павышэння ўстойлівасці функцыянавання кожнай установы, закупку кіслародных канцэнтратараў і СІЗ, наём каардынатара па медыцынскіх пытаннях і кансультанта па барацьбе са стрэсам, арганізацыю дыягностыкі і лячэння супрацоўнікаў і іх утрыманцаў, распрацоўку і ўкараненне пратакола медыцынскай эвакуацыі ў сувязі з COVID-19 (МЕДЭВАК). Каардынацыя дзейнасці ажыццяўлялася праз міжустаноўскія мэтавыя групы, у тым ліку групы, што займаюцца пытаннямі аховы здароўя, сацыяльнага і эканамічнага ўздзеяння пандэміі, уразлівых супольнасцей і правоў чалавека, інфармавання аб рызыках, закупак тавараў медыцынскага прызначэння для барацьбы з пандэміяй COVID-19, каардынацыі дзейнасці донараў і партнёраў, а таксама аховы і бяспекі персаналу. Гэтыя мэтавыя групы сталі важным механізмам, які дазваляе забяспечыць узгодненасць і каардынацыю дзейнасці ўстаноў ААН у рамках барацьбы з пандэміяй COVID-19.

**75-годдзе Арганізацыі Аб’яднаных Нацый**.
Яшчэ адной галіной, у якой можна адзначыць актывізацыю супрацоўніцтва паміж структурамі ААН, стала дзейнасць, звязаная са святкаваннем 75-годдзя Арганізацыі Аб’яднаных Нацый. КГААН ініцыіравала абмеркаванні ў фарматах анлайн і афлайн з удзелам супольнасцей па ўсёй краіне, у рамках якіх былі разгледжаны такія тэндэнцыі, як кліматычны крызіс, беднасць і няроўнасць, зацяжныя канфлікты, міграцыя і перамяшчэнне насельніцтва, а таксама хуткія змены ў дэмаграфіі і тэхналогіях. У рамках агульнанацыянальнай кампаніі ў партнёрстве з Міністэрствам адукацыі і некалькімі ўніверсітэтамі ААН арганізавала шэраг мерапрыемстваў на рэгіянальным узроўні з удзелам моладзі. Кожнае мерапрыемства праводзілася пры садзейнічанні канкрэтнай установы ААН і было прысвечана пытанням, звязаным з яго мандатам. Акрамя таго, у супрацоўніцтве з Міністэрствам замежных спраў ААН правяла гістарычную выставу, прысвечаную 75-годдзю Канферэнцыі ў Сан-Францыска і Дню Статута ААН. Цыкл памятных мерапрыемстваў завяршыўся Фестывалем моладзевых СМІ і тэматычнай дыскусіяй «Насустрач будучыні, якую мы хочам: моладзевая пазіцыя», удзел у якой прынялі маладыя актывісты і партнёры ААН з усёй краіны.









## 2.5. Ацэнка дзейнасці і атрыманыя ўрокі

У 2019 годзе была праведзена незалежная ацэнка вынікаў, дасягнутых у рамках рэалізацыі Рамачнай праграмы Арганізацыі Аб’яднаных Нацый па аказанні Рэспубліцы Беларусь дапамогі ў мэтах развіцця (РПААНДР) на 2016–2020 гады. Падчас ацэнкі быў вывучаны ўклад структур Сістэмы развіцця ААН, якія ажыццяўлялі дзейнасць у Беларусі па чатырох стратэгічных напрамках, прадугледжаных РПААНДР: інклюзіўнае, адказнае і падсправаздачнае кіраванне; устойлівае эканамічнае развіццё; ахова навакольнага асяроддзя і ўстойлівае прыродакарыстанне; устойлівае развіццё чалавечага капіталу.

На падставе вынікаў ацэнкі, абноўленых у 2020 годзе, быў зроблены вывад аб тым, што з 60 паказчыкаў дасягнення вынікаў, прадугледжаных РПААНДР, мэтавыя значэнні былі дасягнуты па 26 паказчыках, яшчэ па 13 паказчыках работа выканана ў адпаведнасці з намечаным курсам, але мэтавыя значэнні к канцу 2020 года дасягнуты не поўнасцю;




43 % Дасягнута – 26 паказчыкаў
22 % У адпаведнасці з намечаным курсам – 13 паказчыкаў
5 % Не дасягнута – 3 паказчыкі
30 % Не прымянімыя – 18 паказчыкаў

і па 3 паказчыках мэтавыя значэнні не дасягнуты. Падчас ацэнкі было выяўлена 18 паказчыкаў, маніторынг якіх быў ускладнены адсутнасцю даных або метадалагічнымі праблемамі.

Да канца 2020 года дзякуючы дасягненням у рэалізацыі Павесткі дня ў галіне ўстойлівага развіцця беларускі ўрад і КГААН мелі магчымасць засяродзіць сваю ўвагу на рашэнні найбольш прыярытэтных задач у галіне развіцця пры дапамозе прадастаўлення якасных кансультацый па стратэгічных пытаннях і нарошчвання патэнцыялу, выкарыстання сусветнага вопыту і экспертных ведаў, а таксама шляхам каардынацыі і аб'яднання намаганняў розных зацікаўленых бакоў. Па выніках ацэнкі быў зроблены вывад аб тым, што за апошнія гады ў Беларусі значна зменшылася доля насельніцтва, што знаходзіцца за рысай беднасці, скарацілася няроўнасць, забяспечана ўсеагульная пачатковая адукацыя, дасягнуты прагрэс у забеспячэнні гендарнай роўнасці за кошт пашырэння ўдзелу жанчын у працэсе прыняцця рашэнняў, а таксама знізіўся ўзровень смяротнасці немаўлят (гэта значыць ва ўзросце да аднаго года), дзіцячай (гэта значыць ва ўзросце да пяці гадоў) і мацярынскай смяротнасці. Акрамя таго, краіна дасягнула прагрэсу ў галіне аховы здароўя, знізіўшы ўзровень захворвальнасці туберкулёзам і распаўсюджанасць актыўных формаў туберкулёзу; аховы навакольнага асяроддзя, зменшыўшы агульны аб'ём выкідаў вуглякіслага газу і павялічыўшы плошчу зямель, якія ахоўваюцца ў мэтах падтрымання біялагічнай разнастайнасці, пакрытых лясамі, і тых, якія маюць статус нацыянальных паркаў і запаведнікаў; і добраўпарадкавання гарадскіх населеных пунктаў, павысіўшы даступнасць жылля і палепшыўшы ўмовы пражывання.

Разам з тым інтарэс донараў да Беларусі і аб'ём фінансавання, што імі выдзяляецца, працягнулі зніжацца з прычыны таго, што Беларусь уваходзіць у лік краін з узроўнем даходу, вышэйшым за сярэдні. У гэтай сувязі захаваецца актуальнасць падыходаў, у рамках якіх прыярытэт надаецца доўгатэрміновым стратэгічным мерапрыемствам, што накіраваны на дасягненне канкрэтных вынікаў, узгоднены з нацыянальнымі прыярытэтамі і рэалізуюцца з акцэнтам на ўстойлівасць. Важна адзначыць, што ў сувязі з пандэміяй COVID-19 аказанне медыцынскіх паслуг стала адным з галоўных прыярытэтаў КГААН.

Наступныя вывады былі зроблены па выніках ацэнкі і ў далейшым улічаны пры распрацоўцы новай РПААНСУР на 2021–2025 гады:

- ААН здольная дабівацца вынікаў у складаных абставінах, якія характарызуюцца наяўнасцю мноства зацікаўленых бакоў, а таксама ў далікатных з палітычнага пункту погляду галінах праз садзейнічанне прымяненню міжнародных стандартаў, аказанне экспертнай падтрымкі і ўкараненне перадавога вопыту.
- РПААНДР прадэманстравала свой інстытуцыянальны патэнцыял у якасці аб'яднальнага механізма, здольнага забяспечыць зладжанае ўзаемадзеянне ўсіх устаноў ААН для дасягнення агульных мэт.
- Наступная Рамачная праграма Арганізацыі Аб'яднаных Нацый супрацоўніцтва ў галіне ўстойлівага развіцця (РПААНСУР) можа стаць магутным інструментам для кіравання калектыўнай і скаардынаванай дзейнасцю ўстаноў ААН. Для паспяховай рэалізацыі РПААНСУР неабходна ўдзяліць прыярытэтную ўвагу стратэгічным мерапрыемствам, якія арыентаваны на доўгатэрміновую перспектыву, узгоднены з МУР і нацыянальнымі прыярытэтамі, маюць канкрэтныя мэты і рэалізуюцца з акцэнтам на ўстойлівасць.
- Установы ААН змогуць дабіцца большага поспеху, калі засяродзяцца як на рашэнні задач, якія не патрабуюць празмерных намаганняў, так і на рэалізацыі больш стратэгічных мерапрыемстваў, накіраваных на ліквідацыю карэнных прычын няроўнасці і ўразлівасці.
- У Беларусі добра наладжана работа дзяржаўных службаў, якія здольныя эфектыўна рэалізоўваць дзяржаўную палітыку і праграмы. Дзейнасць ААН прыносіць найбольшую практычную аддачу і мае ўстойлівы характар у тых выпадках, калі ўстановы засяроджваюцца на прадастаўленні экспертнай падтрымкі і палітычных кансультацый, а таксама пры неабходнасці ажыццяўляюць эксперыментальнае ўкараненне інавацый і дэманструюць эфектыўныя рашэнні ў рамках рэалізацыі праектаў на месцах.

- Актуальнасць і эфектыўнасць работы, якая выконваецца ў рамках рэалізацыі РПААНДР, можна было б павысіць пасля правядзення сярэднетэрміновага агляду. Перагляд стратэгічных прыярытэтаў і ўдасканальванне механізмаў кантролю і ацэнкі, прадугледжаных РПААНДР, дазволілі б сістэме ААН больш эфектыўна рэагаваць на змены ў нацыянальным кантэксце і агульнай эканамічнай сітуацыі.

Новая Рамачная праграма супрацоўніцтва на 2021–2025 гады была распрацавана з улікам важных вывадаў, зробленых па выніках рэалізацыі РПААНДР, а таксама параўнальных пераваг структур Сістэмы развіцця ААН, мае прадуманы механізм маніторынгу з прыцягненнем шырокага кола ўдзельнікаў, узгоднена з МУР і нацыянальнымі прыярытэтамі і з'яўляецца стратэгічным і прагматычным дакументам, арыентаваным на выпрацоўку палітыкі і дасягненне канкрэтных вынікаў. Уключэнне праваабарончага кампанента ў РПААНСУР павінна забяспечыць задавальненне патрэбнасцей уразлівых груп. Дзякуючы рэалістычна сфармуляваным вынікам, належнаму планаванню, камунікацыі, палепшанай каардынацыі і эфектыўнаму маніторынгу РПААНСУР можа заставацца актуальнай і карыснай на працягу ўсяго цыкла яе рэалізацыі. У новай структуры ААН Офіс Пастаяннага каардынатара валодае ўнікальнымі магчымасцямі для аказання дапамогі ў вызначэнні галоўных прыярытэтаў сумеснай дзейнасці ААН, садзейнічання працэсу стратэгічных кансультацый паміж установамі ААН, нацыянальнымі партнёрамі і донарамі.

## 2.6. Агляд фінансавага становішча і мабілізацыя рэсурсаў

Па ацэнках, агульны аб'ём фінансавых рэсурсаў, якія спатрэбіліся сістэме Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у Беларусі ў перыяд з 2016 па 2020 год для дасягнення васьмі вынікаў у чатырох стратэгічных галінах РПААНДР, склаў 111 328 000 дол. ЗША, з якіх 38 964 992 дол. ЗША былі даступны ўстановам і 72 363 008 дол. ЗША неабходна было мабілізаваць падчас праграмнага цыкла.

Меркавалася, што аб'ём фінансавай дапамогі, якую сістэма ААН магла б мабілізаваць у мэтах развіцця для такой краіны з узроўнем даходу, вышэйшым за сярэдні, як Беларусь, будзе абмежаваным. Таму ўстановы ААН планавалі засяродзіцца на выкарыстанні сваіх параўнальных пераваг, падрыхтоўцы сумесных прапаноў па фінансаванні, наладжванні шырокіх партнёрскіх сувязей з донарамі, мабілізацыі рэсурсаў за кошт сумеснага нясення выдаткаў з удзелам трэціх бакоў і прыцягнення сродкаў глабальных мэтавых фондаў, фондаў і прадпрыемстваў прыватнага сектара.

К канцу 2020 года ААН не дасягнула ў поўным аб'ёме прадугледжаных РПААНДР мэтавых паказчыкаў па мабілізацыі рэсурсаў, паколькі структуры ААН, якія падпісалі РПААНДР, змаглі мабілізаваць і забяспечыць 76 працэнтаў (85 125 000 дол. ЗША) ад агульнага аб'ёму рэсурсаў, якія планавалася мабілізаваць у рамках рэалізацыі РПААНДР. Пры гэтым у 2020 годзе зрасходавана 21 465 700 дол. ЗША, або 25 працэнтаў рэсурсаў, мабілізаваных для рэалізацыі РПААНДР. У апошні год ажыццяўлення РПААНДР КГААН удалося выдзеліць асноўныя рэсурсы ў аб'ёме 3 342 651 дол. ЗША і мабілізаваць донарскія сродкі ў аб'ёме 18 153 049 дол. ЗША, нягледзячы на ўсе абмежаванні, абумоўленыя пандэміяй COVID-19, і зніжэнне ўвагі донараў да Беларусі.

***Фінансавыя рэсурсы для рэалізацыі РПААНДР***



Асноўнымі донарамі, якія выдзелілі фінансаванне для рэалізацыі РПААНДР у 2020 годзе, сталі Еўрапейскі саюз, Глабальны экалагічны фонд (ГЭФ), Расійская Федэрацыя, Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці (ЮСАІД), Германія, Польшча, Вялікабрытанія, Нарвегія, Швецыя, Глабальны фонд для барацьбы са СНІДам, туберкулёзам і малярыяй (ГФСТМ), Сусветны банк, Эстонія, АБСЕ. Установам ААН таксама ўдалося мабілізаваць дадатковыя рэсурсы за кошт партнёрства з прыватным сектарам і выкарыстання спецыяльных сродкаў устаноў, атрыманых на конкурснай аснове і прызначаных для змякчэння наступстваў пандэміі COVID-19.

***Агульны аб'ём рэсурсаў, мабілізаваных і выдзеленых структурамі ААН у 2020 годзе, з разбіўкай па донарах***




На здольнасць ААН мабілізаваць фінансавыя рэсурсы для ажыццяўлення РПААНДР у 2016–2020 гадах паўплывала мноства фактараў, уключаючы скарачэнне асноўных карпаратыўных рэсурсаў, зніжэнне зацікаўленасці донараў і мінімальны ўдзел нацыянальных партнёраў у сумесным пакрыцці выдаткаў. Установы ААН дабіліся вельмі абмежаванага поспеху ў выкарыстанні мадэлі сумеснага нясення выдаткаў з нацыянальнымі партнёрамі. У краінах з узроўнем даходу, вышэйшым за сярэдні, такіх як Чарнагорыя, Казахстан, Азербайджан, вельмі добра наладжана бізнес-мадэль, у рамках якой дзяржаўныя бюджэтныя рэсурсы эфектыўна выкарыстоўваюцца сістэмай ААН. Аднак у Беларусі гэты механізм задзейнічаны ў недастатковай ступені. Установы ААН імкнуліся выкарыстоўваць усе магчымасці для дэманстрацыі эфектыўнасці сваіх сістэм і маштабнай эканоміі сродкаў дзяржаўнага бюджэту, якой магчыма дасягнуць у шэрагу галін за кошт рэалізацыі дзяржаўных праграм з дапамогай ААН (напрыклад, медыцынскія і іншыя закупкі на міжнародных рынках, дзе ўстановы ААН маюць доступ да працэдуры конкурсных таргоў і больш шырокага асартыменту тавараў). Адна з дамоўленасцей аб партнёрстве, дасягнутых у 2020 годзе, была афіцыйна замацавана ў пагадненні паміж Міністэрствам аховы здароўя, з аднаго боку, і ПРААН і ЮНІСЕФ, з другога боку, аб закупцы тавараў медыцынскага прызначэння, сродкаў індывідуальнай засцярогі, высокадакладнага і лабараторнага абсталявання для ўмацавання сістэмы аховы здароўя ў рамках крэдыту Сусветнага банка.

# ГЛАВА 3. АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ РАБОТЫ КГААН У 2021 ГОДЗЕ

У сваёй рабоце ў Беларусі ў 2021 годзе ААН будзе кіравацца нядаўна распрацаванай Рамачнай праграмай супрацоўніцтва ААН у галіне ўстойлівага развіцця на 2021–2025 гады і яе чатырма стратэгічнымі прыярытэтамі. Гэта работа будзе праводзіцца ў кантэксце пандэміі COVID-19, якая працягваецца, і будзе накіравана на аказанне падтрымкі краіне ў пераадоленні разнастайных наступстваў гэтай пандэміі. На працягу першага года РПААНСУР увага КГААН будзе засяроджана на наступных прыярытэтных напрамках дзейнасці:

**Пераадоленне наступстваў пандэміі COVID-19:**

- Забеспячэнне гатоўнасці да надзвычайных сітуацый на нацыянальным узроўні і павышэнне эфектыўнасці мер рэагавання на пандэмію COVID-19.
- Пераадоленне сацыяльна-эканамічных наступстваў пандэміі, асабліва для ўразлівых груп.
- Павышэнне ўстойлівасці нацыянальнай сістэмы аховы здароўя, з тым каб яна магла эфектыўна змагацца з інфекцыйнымі і неінфекцыйнымі захворваннямі.
- Пашырэнне інфармацыйна-растлумачальнай дзейнасці ў рамках сацыяльна-эканамічных мер рэагавання на пандэмію COVID-19.

**Павышэнне ўстойлівасці і больш эфектыўнае аднаўленне для дасягнення ўстойлівага развіцця:**

- Наладжванне партнёрскіх сувязей з грамадзянскай супольнасцю.
- Садзейнічанне больш шырокаму выкарыстанню лічбавых тэхналогій у інтарэсах устойлівага развіцця.
- Акцэнт на сістэмных пераўтварэннях у інтарэсах уразлівых груп дзяцей, падлеткаў і моладзі.
- Далейшае ўзаемадзеянне з нацыянальнай архітэктурай кіравання працэсам дасягнення МУР, уключаючы партнёрствы і рэалізацыю ініцыятыў у супрацоўніцтве з дзяржаўнымі ўстановамі, арганізацыямі грамадзянскай супольнасці, прыватным сектарам і навуковымі коламі.
- Выкарыстанне валанцёрскіх рэсурсаў і садзейнічанне развіццю салідарнасці паміж пакаленнямі ў мэтах забеспячэння сацыяльнай інтэграцыі і ўстойлівасці супольнасцей.
- Садзейнічанне сацыяльна-эканамічнаму развіццю на мясцовым узроўні.
- Садзейнічанне пашырэнню правоў і магчымасцей і павышэнню ўзроўню самазабяспечанасці асоб, якія атрымалі статус бежанца і дадатковую абарону ў Беларусі, прасіцеляў прыстанішча і асоб без грамадзянства праз адукацыю, працаўладкаванне (уключаючы самазанятасць), арганізацыю курсаў рускай мовы і іншыя мерапрыемствы.
- Падтрымка сацыяльных і тэхналагічных інавацый, у тым ліку ў кантэксце развіцця цыркулярнай эканомікі і ўкаранення прынцыпаў «зялёнай» эканомікі.
- Аказанне падтрымкі ўрадавым і няўрадавым партнёрам у ажыццяўленні палітыкі і дзейнасці, заснаванай на прынцыпе захавання правоў чалавека, заахвочванні гендарнай роўнасці і рэалізацыі прынцыпу «нікога не пакінуць у баку».
- Наладжванне партнёрскіх адносін з шырокім колам нацыянальных і міжнародных партнёраў і мабілізацыя рэсурсаў.

# СПІС СКАРАЧЭННЯЎ:

| | |
|---|---|
| $CO_2$ | Вуглякіслы газ |
| COVID-19 МЕДЭВАК | Медыцынская эвакуацыя, звязаная з COVID-19 |
| ААН-Хабітат | Праграма Арганізацыі Аб’яднаных Нацый па населеных пунктах |
| АБСЕ | Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе |
| АЗТ | Апіёідная замяшчальная тэрапія |
| ВІЧ/СНІД | Вірус імунадэфіцыту чалавека/ сіндром набытага імунадэфіцыту |
| ВУП | Валавы ўнутраны прадукт |
| ГФСТМ | Глабальны фонд для барацьбы са СНІДам, туберкулёзам і малярыяй |
| ГЭФ | Глабальны экалагічны фонд |
| ЕБРР | Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця |
| ЕС | Еўрапейскі саюз |
| ЕЭК ААН | Еўрапейская эканамічная камісія Арганізацыі Аб’яднаных Нацый |
| КГААН | Краінавая група Арганізацыі Аб’яднаных Нацый |
| КПІ ААН | Канвенцыя Арганізацыі Аб’яднаных Нацый аб правах інвалідаў |
| МАГАТЭ | Міжнароднае агенцтва па атамнай энергіі |
| МАМ | Міжнародная арганізацыя па міграцыі |
| МАП | Міжнародная арганізацыя працы |
| МВФ | Міжнародны валютны фонд |
| МГЦ | Міжнародны гандлёвы цэнтр |
| МЗС Нарвегіі | Міністэрства замежных спраў Нарвегіі |
| МСП | Малыя і сярэднія прадпрыемствы |
| МСЭ | Міжнародны саюз электрасувязі |
| МУР | Мэты ўстойлівага развіцця |
| МФК | Міжнародная фінансавая карпарацыя |
| МФУ | Міжнародныя фінансавыя ўстановы |
| ПРААН | Праграма развіцця Арганізацыі Аб’яднаных Нацый |
| РПААНДР | Рамачная праграма Арганізацыі Аб’яднаных Нацый па аказанні дапамогі ў мэтах развіцця |
| РПААНСУР | Рамачная праграма супрацоўніцтва Арганізацыі Аб’яднаных Нацый у галіне ўстойлівага развіцця |
| СААЗ | Сусветная арганізацыя аховы здароўя |
| САД | Стратэгія аператыўнай дзейнасці |
| СГА | Сусветная гандлёвая арганізацыя |
| СІЗ | Сродкі індывідуальнай засцярогі |
| СНД | Садружнасць Незалежных Дзяржаў |
| Структура «ААН-жанчыны» | Структура Арганізацыі Аб’яднаных Нацый па пытаннях гендарнай роўнасці і пашырэння правоў і магчымасцей жанчын |
| УВКБ ААН | Упраўленне Вярхоўнага камісара Арганізацыі Аб’яднаных Нацый па справах бежанцаў |
| УВКПЧ | Упраўленне Вярхоўнага камісара Арганізацыі Аб’яднаных Нацый па правах чалавека |
| УЗРБ ААН | Упраўленне Арганізацыі Аб’яднаных Нацый па зніжэнні рызыкі бедстваў |
| УНЗ ААН | Упраўленне Арганізацыі Аб’яднаных Нацый па наркотыках і злачыннасці |
| ФАА | Харчовая і сельскагаспадарчая арганізацыя |
| ЮНІДА | Арганізацыя Аб’яднаных Нацый па прамысловым развіцці |
| ЮНІСЕФ | Дзіцячы фонд Арганізацыі Аб’яднаных Нацый |
| ЮНКТАД | Канферэнцыя ААН па гандлі і развіцці |
| ЮНОПС | Упраўленне ААН па абслугоўванні праектаў |
| ЮНФПА | Фонд Арганізацыі Аб’яднаных Нацый у галіне народанасельніцтва |
| ЮНЭЙДС | Аб’яднаная праграма Арганізацыі Аб’яднаных Нацый па ВІЧ/СНІД |
| ЮСАІД | Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці |